ЗААХВОЧВАЛЬНЫЯ АБАРАНКІ АД ПРАФЕСАРА 6

ГАЮЧЫЯ ЖУРАВІНЫ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

27 ЛІСТАПАДА 2024 г.
СЕРАДА
№ 231 (30365)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

КАРАТКА

- **Для аплаты за паслугі газазабеспячэння ў АРІП пераходзім на новае адгалінаванне.**
- Нафтахімічныя прадпрыемствы Беларусі ўдзельнічаюць у міжнароднай шматгаліновай выставе MUSIAD Expo ў сталіцы Турцыі, дзе сваю прадукцыю дэманструюць «Гродна Азот», «Лакафарба», Завод горнага воску, «Магілёўхімвалакно» і «Нафтан».
- **Біржавы гандаль несыравіннымі таварамі будуць развіваць Беларусь і Самарская вобласць.**
- Пераднавагоднія кірмашы адкрыюцца ў Брэсце 1 снежня.
- **Каля 2,3 тыс. вялікагрузаў прастойваюць перад усімі еўрапейскімі пунктамі пропуску.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Марыя МАЖЫНСКАЯ, намеснік міністра эканомікі:

«З улікам аналізу існуючай сітуацыі міністэрствам сумесна з аблвыканкамамі і іншымі зацікаўленымі выпрацаваны прапановы па ўдакладненні крытэрыяў уключэння праектаў у пералік «Адзін раён — адзін праект». У першую чаргу, гэта з'яўленне ў рэгіёне новых вытворчасцяў або мадэрнізацыя існуючых. Апошняе мае на ўвазе пашырэнне вытворчасці, выпуск новых відаў прадукцыі на дзеючым прадпрыемстве. З улікам спецыфікі раёна будзе падтрымана стварэнне камерцыйных аб'ектаў транспартна-лагістычнай інфраструктуры, турызму і адпачынку, медыцынскага абслугоўвання. Пры гэтым у выніку рэалізацыі праекта павінна быць створана не менш за пяць новых працоўных месцаў або працаўладкавана дадаткова не менш як пяць чалавек».

Фота БелТА.

Аб тым, што візіту Прэзідэнта Беларусі ў Пакістане надаюць асаблівае значэнне, сведчыла нават цырымонія яго сустрэчы — каля трапа кіраўніка нашай дзяржавы вітаў асабіста Прэм'ер-міністр Пакістана Шахбаз Шарыф. А сталіцу ісламскай дзяржавы ўпрыгожыла беларуская нацыянальная сімволіка і плакаты з партрэтамі Аляксандра Лукашэнкі і вышэйшага кіраўніцтва Пакістана. Самі ж плакаты падпісалі на беларускай і англійскай мовах: «Узаемная павага, давер і партнёрства», «Будуем масты для квітнеючай будучыні», «Партнёры ў прагрэсе і росквіце», «Новая эра супрацоўніцтва». Гэтыя фразы фактычна і сталі дэвізам перагавораў на вышэйшым узроўні.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«АБАВЯЗКОВА ТРЭБА НАШЫ ПАЛІТЫЧНЫЯ АДНОСІНЫ МАНЕТЫЗАВАЦЬ»

Вынікі афіцыйнага візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Пакістан

У Ісламабадзе Аляксандр Лукашэнка правёў перагаворы з Прэм'ер-міністрам Пакістана Шахбазам Шарыфам. Сустрэча прайшла ў вузкім фармаце і пашыраным складзе з удзелам членаў дэлегацый. Бакі разгледзелі найбольш перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва і абмеркавалі сумесны план дзеянняў на будучыню. Асобная ўвага была ўдзелена тэме рэгіянальнай і глабальнай бяспекі, узаемадзеянню ў інтэграцыйных аб'яднаннях і сумеснай рабоце на міжнародных пляцоўках.

Ад дамоўленасцяў да канкрэтных дзеянняў

На перагаворах у пашыраным складзе Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Беларусь і Пакістан маюць бліскучыя палітычныя адносіны, цяпер неабходна падцягнуць да гэтага ўзроўню гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва.

«Мы не гіганцкая краіна, і на гігантаманію ніколі не пакутавалі і не пакутуем. Але ад Савецкага Саюза, які быў высокатэхналагічнай краінай, нам дасталіся добрыя тэхналогіі, якія мы апошнім часам развілі. І я ўпэўнены, што тыя тэхналогіі, якімі мы валодаем, вельмі патрэбныя Пакістану», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, бакі дамовіліся правесці рэвізію адносін і лепш азнаёміцца з магчымасцямі адзін аднаго. «Я запрасіў вашых міністраў і спецыялістаў, кіраўнікоў кампаній прыехаць у Беларусь, яшчэ раз паглядзець на нашы магчымасці і ўзяць тое, што вам трэба. Закрытых тэм няма», — заявіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы таксама выказаў падзяку прэм'ер-міністру Пакістана за тое, што ён узяў на кантроль пастаўкі беларускай тэхнікі. «Вы ведаеце, што мы можам паставіць вам патрэбныя аб'ёмы прадуктаў харчавання, у тым ліку дзіцячага, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — І вельмі правільна, што вы дамовіліся аб тым, што пасля нашай сустрэчы ў шырокім складзе нашы міністры дамовяцца аб канкрэтных дзеяннях. Дапусцім, міністр прамысловасці можа дамовіцца з вашым міністрам прамысловасці аб далейшых дзеяннях».

СТАР. 2

Карысна ведаць

ПРА КРЭДЫТНЫЯ ГІСТОРЫІ І НЕ ТОЛЬКІ

Узмоцнена абарона атрымальнікаў крэдытаў

Як паведаміла прэс-служба Нацбанка, з 5 студзеня наступнага года ў нашай краіне зменіцца парадак фарміравання крэдытных гісторый і атрымання крэдытных справаздач. Рашэнне аб гэтым прынята пастановай Праўлення Нацыянальнага банка ад 2 кастрычніка 2024 года (далей — пастанова № 310).

СТАР. 3

Прыкметы часу

ФАРМАТЫ ПАД РОЗНЫЯ ЗАПЫТЫ

Якія ўстановы грамадскага харчавання адкрываюцца сёння ў Беларусі

Вечар у рэстаране ці абед ва ўтульной кавярні — самы просты (хоць і не заўсёды танны) спосаб атрымання «гармону задавальнення» — дафаміну. Пакаштаваць яркія стравы, пагутарыць з прыемнымі людзьмі, палепшыць настрой і акунуцца ў асаблівую атмасферу, «змяніць лакацыю» і «пераключыць увагу» — усё гэта дае нам добры рэстаран.

Ключавое слова тут — «добры». Заўважым: «пафасны» або «дарагі» — зусім не сінонім гэтаму азначэнню. Каб усё склалася, патрэбныя і смак, і водар страў, і іх знешні выгляд, і агульная канцэпцыя ўстановы, і афармленне залы, і прафесійны персанал.

СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

«АБАВЯЗКОВА ТРЭБА НАШЫ ПАЛІТЫЧНЫЯ АДНОСІНЫ МАНЕТЫЗАВАЦЬ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт даручыў міністру замежных спраў Максіму Рыжанкову ўзяць гэту работу на кантроль. Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу выпрацаваць прапановы ад беларускага боку і ўнесці іх на разгляд. «Проста вельмі вас прашу, каб ніводзін міністр, які знаходзіцца ў маёй дэлегацыі, калі не з партфелем цікавых пытанняў у Беларусь з'ехаў, то хаця б адно-два пытанні павёз для вырашэння з Пакістана. Ніякіх турыстычных паездак быць не можа. Нам патрэбны практычныя крокі. Таму вы твар у твар дамаўляйцеся сёння, сустракайцеся, трэба — заўтра сустракайцеся, колькі трэба сустракайцеся, але дамоўцеся», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён канстатаваў, што Беларусь і Пакістан маюць бліскучыя палітычныя адносіны, а вось гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, нягледзячы на тое, што краіны патрэбны адна адной, развіваецца не вельмі актыўна. «Нам вельмі цікавая ваша прапанова па транспартным калідоры, асабліва цяпер. Мы пачулі вас наконт бязвізу. Міністр замежных спраў ведае вельмі добра нашу палітыку. Думаю, што і тут асаблівых у нас праблем не будзе», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У час перагавораў кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь катэгарычна супраць нагнятання сітуацыі паміж Пакістанам і Індыяй. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што добра азнаёмлены з сітуацыяй у Джаму і Кашміры. Нявызначаны статус гэтай тэрыторыі ўжо даўно з'яўляецца чыннікам канфлікту паміж Пакістанам і Індыяй. «Мы катэгарычна супраць нагнятання сітуацыі паміж суседнімі дзяржавамі. Мы вас у гэтых адносінах падтрымаем. Павінна быць мірнае вырашэнне гэтага пытання», — падкрэсліў Прэзідэнт.

У сваю чаргу прэм'ер-міністр Пакістана падкрэсліў, што беларускі лідар з'яўляецца вялікім сябрам Пакістана і ў фармаце «адзін на адзін» бакі ўжо змаглі абмеркаваць шэраг надзённых і важных пытанняў. «Вы чалавек практыкі, таму мы сёння пастараемся гаварыць менш, але больш ажыццяўляць практычныя рэчы», — сказаў Шахбаз Шарыф.

Паводле яго слоў, Пакістан зацікаўлены ў тэхналогіях, якія ёсць у Беларусі, напрыклад, у цяжкай прамысловасці, машынабудаванні, сельскай гаспадарцы. «У нас ёсць свае тавары ў галіне сельскай гаспадаркі, тэкстыльная прамысловасць, якія ў многім маюць патрэбу ў тэхналогіях. Гэтыя тэхналогіі нам можа даць Беларусь. Мы лічым, што ваша вялікая краіна зможа істотна дапамагчы Пакістану дасягнуць пастаўленых мэт», — заявіў прэм'ер-міністр.

Ён прапанаваў членам дэлегацыі дэталёва і прадметна абмеркаваць канкрэтныя пытанні па рэалізацыі перспектыўных кірункаў узаемадзеяння, каб усе дамоўленасці не засталіся проста на паперы, а абавязкова рэалізаваліся.

Па выніках перагавораў бакі зацвердзілі дарожную карту па развіцці ўсебаковага супрацоўніцтва на найбліжэйшыя гады. Подпісы пад дакументам паставілі сустаршыні беларуска-пакістанскай міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве міністр энергетыкі Аляксей Кушнарэнка і міністр гандлю Джам Камал Хан.

Прыхільнасць да паглыблення сувязяў ва ўсіх сферах

Па выніках перагавораў у Ісламабадзе Прэзідэнт Беларусі і прэм'ер-міністр Пакістана прынялі сумесную заяву. У дакументе адзначаецца, што лідары дзвюх краін разгледзелі ўвесь спектр двухбаковых адносін і пацвердзілі ўзаемную прыхільнасць да паглыблення дружалюбных сувязяў паміж дзвюма краінамі ў палітычнай, гандлёва-эканамічнай, культурнай, сацыяльнай і іншых галінах.

«У гэтым годзе споўнілася 30 гадоў дыпламатычным адносінам паміж Пакістанам і Беларуссю. Абодва бакі прызналі, што іх адносіны перараслі ў трывалае, шырокамаштабнае і ўсёабдымнае партнёрства, якое мае ўсё большае значэнне, — гаворыцца ў заяве. — Падчас сустрэчы абодва лідары падкрэслілі важнасць прасоўвання палітычнага дыялогу і ўмацавання міжпарламенцкіх адносін».

Увага таксама была засяроджана на пашырэнні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, ажыццяўленні сумеснага падыходу да рэгіянальнай эканамічнай інтэграцыі і ўзаемасувязяў, а таксама паляпшэнні прававой базы для садзейнічання двухбаковаму супрацоўніцтву. «Прызнаючы перадавыя магчымасці сельскагаспадарчай вытворчасці Беларусі і патрэбы пакістанскай эканомікі, заснаванай на сельскай гаспадарцы, абодва бакі дамовіліся садзейнічаць стварэнню сумесных прадпрыемстваў у сельскагаспадарчым і прамысловым сектарах, у тым ліку для вытворчасці высокатэхналагічнай і буйнагабарытнай сельскагаспадарчай тэхнікі», — адзначаецца ў заяве.

Бакі дамовіліся супрацоўнічаць у сферы продажаў, вытворчасці і абслугоўвання аўтамабільнай тэхнікі, у тым ліку праз партнёрства паміж прыватнымі і дзяржаўнымі арганізацыямі дзвюх краін. Гэта ініцыятыва накіравана на выкарыстанне моцных бакоў абедзвюх краін у аўтамабільнай вытворчасці і тэхналогіях і стымуляванне прамысловага росту.

Заклік да міру і дыялогу

Аляксандр Лукашэнка і Шахбаз Шарыф таксама абмеркавалі важныя рэгіянальныя і міжнародныя пытанні. Пакістанскі бок праінфармаваў беларускі аб сітуацыі ў рэгіёне Джаму і Кашмір. Абодва бакі падкрэслілі неабходнасць урэгулявання ўсіх міжнародных спрэчак мірнымі сродкамі і ў адпаведнасці са Статутам ААН і рэзалюцыямі Савета Бяспекі ААН.

Аляксандр Лукашэнка і Шахбаз Шарыф у сумеснай заяве выказалі глыбокую занепакоенасць эскалацыяй канфлікту на Блізкім Усходзе, які прывёў да разбуральнага гуманітарнага крызісу і значных ахвяр сярод цывільнага насельніцтва ў сектары Газа і Ліване. «Бакі заклікалі да неадкладнага і пастаяннага спынення баявых дзеянняў без папярэдніх умоў у сектары Газа і Ліване, удараў па тэрыторыі Сірыйскай Арабскай Рэспублікі, забеспячэння бесперабойнай і бяспечнай дастаўкі гуманітарнай дапамогі, стрыманасці на фоне пагрозы пашырэння зоны канфлікту, падкрэслілі неабходнасць актывізацыі намаганняў па дасягненні міру, стабільнасці і бяспекі для ўсяго рэгіёна», — гаворыцца ў дакументе.

У сумеснай заяве бакі пацвердзілі сваю прыхільнасць да права палесцінскага народа на самавызначэнне і стварэнне незалежнай палесцінскай дзяржавы на аснове двухдзяржаўнай формулы ў адпаведнасці з рашэннямі Савета Бяспекі і Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Аляксандр Лукашэнка і Шахбаз Шарыф таксама падкрэслілі першачарговую важнасць мірнага ўрэгулявання канфлікту ва Украіне, неабходнасць дыпламатычных намаганняў і канструктыўнага дыялогу. Яны адзначылі, што канфлікт мае маштабныя наступствы не толькі для рэгіёна, але і для глабальнай стабільнасці і бяспекі.

«Абодва лідары заклікалі ўсе ўцягнутыя бакі аддаць прыярытэт перагаворам і мірным сродкам вырашэння ўсіх асноўных праблем, пацвердзіўшы сваю прыхільнасць да падтрымкі ініцыятыў, якія садзейнічаюць трываламу міру і стабільнасці ў рэгіёне», — адзначаецца ў сумеснай заяве.

***

Пасля цырымоніі падпісання дакумента Аляксандр Лукашэнка таксама ўручыў Шахбазу Шарыфу сертыфікат на два трактары BELARUS-1025.3. Яны будуць бясплатна перададзены пакістанскай кампаніі Heavy Industries Taxila.

У размове з журналістамі

Намеры — добра, а пагадненні і кантракты — лепш

Гаворачы па выніках перагавораў з журналістамі аб падпісанай раней дарожнай карце, Прэзідэнт заявіў, што, на яго думку, гэтага ўсё яшчэ недастаткова. «Рыхтуючыся да гэтай сустрэчы, я падумаў аб тым, што мемарандумы — гэта добра, гэта намеры, як мы будзем развіваць супрацоўніцтва. Але нам патрэбны пагадненні і кантракты. І ён (прэм'ер-міністр Пакістана. — **«Зв.»**) як быццам ведаў мае думкі і слова ў слова мне кажа: «Слухай, мемарандумы добра, але нам патрэбныя дагаворы і кантракты. Давай сустрэнемся ў Мінску і падпішам гэтыя дагаворы і кантракты ў плане тых намераў, якія сёння ажыццявілі». Бліскучая прапанова!» — заявіў Аляксандр Лукашэнка падчас размовы з журналістамі.

Прэзідэнт нагадаў, што Беларусь і Пакістан супрацоўнічаюць на працягу 30 гадоў, за гэты час шмат ужо зрабілі. Навошта тады новая дарожная карта? «Дарожная карта патрэбна актуалізаваная, сучасная. Трэба адкінуць тое, што не працуе, што нам ува гуле сёння ў сувязі са змяненнем свету не трэба, — растлумачыў ён. — І спецыялісты з Пакістана нядрэнна ведаюць Беларусь, але пажадана сучасную Беларусь паглядзець. І Шахбаз гаворыць: «Нашы спецыялісты праз два тыдні гатовы быць у Мінску для таго, каб паглядзець, удакладніць некаторыя пагадненні і кантракты». У лютым ён гатовы да нас прыехаць, і мы ўжо падпішам адпаведныя пагадненні і кантракты ў развіццё сённяшніх нашых намераў».

«Мы таксама канстатавалі сёння галоўны факт у нашых адносінах. У нас бліскучыя дыпламатычныя адносіны. Мы аднолькава бачым міжнародны парадак дня. Але мы значна адстаём у гандлёва-эканамічных адносінах ад тых магчымасцяў, якія існуюць паміж нашымі краінамі. Таму нам абавязкова трэба нашы палітычныя адносіны манетызаваць. Трэба паглыбіць і развіць гандлёва-эканамічныя адносіны», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Закрытых тэм у супрацоўніцтве няма

Кіраўнік беларускай дзяржавы расказаў, што ў час перагавораў бакі абмеркавалі ўвесь спектр супрацоўніцтва: ад сельскай гаспадаркі да ваенна-прамысловага комплексу. «Закрытых тэм у супрацоўніцтве Беларусі і Пакістана сёння няма. Мы будзем развіваць усё, што цікавіць Пакістан. У нас ёсць усё тое, што трэба сёння і, можа быць, нават заўтра Пакістану. Я маю на ўвазе тэхналогіі, якія мы захавалі з часоў Савецкага Саюза, мадэрнізавалі і развілі. Мы гатовы гэтым дзяліцца з Пакістанам. Абаронная прамысловасць, сельская гаспадарка, транспарт, лагістыка, сельгасмашынабудаванне, цяжкія грузавікі, электратранспарт... Мы ўсё гэта спецыялістам пакажам. Тое, што вельмі патрэбна сёння Пакістану», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што ў сучасным свеце не толькі буйныя дзяржавы маюць вялікія тэхналогіі. «Гэтыя тэхналогіі ёсць і ў сярэдніх дзяржаў, невялікіх. І Пакістану трэба развіваць адносіны з такімі дзяржавамі. Мы да гэтага гатовы. Мы можам нямала зрабіць для Пакістана. Мы з задавальненнем гатовы купляць тавары, якія вырабляюцца тут. Асабліва тэкстыль і многае іншае. Мы заўсёды ставіліся да Пакістана як да каштоўнага і надзейнага партнёра не толькі ў Паўднёвай Азіі, але і ва ўсім мусульманскім свеце», — заявіў беларускі лідар.

«Беражыце сваю краіну»

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што за рамкамі афіцыйных заяў — афіцыёзу, як выказаўся Прэзідэнт, — хацеў бы звярнуцца да пакістанскага боку з адной асабістай прапановай. «Нашы адносіны ўжо тры дзясяткі гадоў выбудоўваюцца. І я працую Прэзідэнтам столькі ж гадоў. Для мяне Пакістан — гэта не нешта далёкае. Гэта вельмі блізкая і сяброўская для нас краіна. Мы калісьці дамовіліся — больш за 10 гадоў таму — інтэнсіфікаваць нашы адносіны, і за гэты час нямала зрабілі. Тое, што адбываецца ў Пакістане, заўсёды нас хвалюе. Мы перажывалі за вас, калі здарылася страшная паводка. Мы вельмі хвалюемся за вас, калі тут адбываецца тое, што не павінна адбывацца ў вашым грамадстве. Мы таксама вельмі хвалюемся і перажываем за ўсё тое, што адбываецца сёння», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што ў свеце цяпер страшныя перамены, якіх не было некалькі апошніх стагоддзяў. «Свет вельмі турбулентны, змены кожны дзень. І ў гэты складаны час выжывуць толькі тыя краіны, якія будуць адзіныя і народы якіх будуць перажываць за будучыню сваёй дзяржавы. Ідзе перадзел свету. Моцныя, багатыя краіны схапіліся ў гэтай жалезнай схватцы. Цяпер у свеце больш за 50 войнаў і канфліктаў. Ідзе жорсткая барацьба за лідарства сёння, заўтра і ў будучыні. Ваша краіна як гіганцкая, пятая па колькасці насельніцтва ў свеце, натуральна, уцягнута ў гэты вір. Пазіцыя Пакістана на міжнароднай арэне вам выдатна знаёмая. Вы ведаеце, чаго хоча Пакістан. Але тое, чаго вы хочаце, не адпавядае жаданням буйных краін, якія сёння вядуць барацьбу за лідарства», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт нагадаў, што ў Ціхаакіянскім рэгіёне ЗША, Англія, Індыя, Аўстралія (магчыма, падключацца Японія і Паўднёвая Карэя) хочуць стварыць своеасаблівае «ціхаакіянскае НАТА». «Пакістану, які хоча мірна развівацца, гэта, магчыма, нецікава. Таму вас будуць хістаць, у вас будуць пастаянна нагнятаць абстаноўку. І галоўнае, што я хацеў сказаць, гэта ўжо насельніцтва датычыцца: беражыце сваю краіну. Захаваеце — у вас будзе месца для жыцця. Не захаваеце — будзе бяда. Сяброўская вам парада», — сказаў беларускі лідар.

Паводле прэс-службы Прэзідэнта.

ЧАСОПІСУ «АЛЕСЯ» — 100 ГАДОЎ!

Першы нумар часопіса пад назвай «Беларуская работніца і сялянка» выйшаў у свет у лістападзе 1924 года. З таго часу выданне некалькі разоў мяняла назву, але ўжо цягам стагоддзя не мяняецца яго асноўны прынцып — быць часопісам для сучасніц і пра сучасніц.

З векавым юбілеем часопіс «Алеся» павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. «Ад першага нумара і да сёння «Алеся» з'яўляецца сапраўдным летапісам жыцця, добрым суразмоўцам і верным сябрам для розных пакаленняў беларусак. Талент і прафесіяналізм каманды аднадумцаў, уменне адлюстроўваць прыгажосць і глыбіню жаночай натуры, зазірнуць у таямнічы свет жаночага шчасця на працягу гадоў — высокі давер да часопіса», — гаворыцца ў віншаванні.

«Упэўнены, што яркія ідэі, новыя цікавыя праекты і ў далейшым дапамогуць калектыву працягваць слаўныя традыцыі папярэднікаў, садзейнічаць актыўнасці і павышэнню ролі жанчын у грамадстве, умацаванню інстытута сям'і, выхаванню патрыятызму і прапагандзе нацыянальных духоўных каштоўнасцяў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў калектыву выдання моцнага здароўя і дабрабыту, невычэрпнага натхнення і поспехаў у працы на карысць роднай Беларусі.

Маладзёжная палітыка

«Бачу краіну мірнай, квітнеючай. І мы разам ідзём наперад»

У краіне рэалізоўваецца маштабны інфармацыйна-асветніцкі праект Палаты прадстаўнікоў «Моладзь для Беларусі!»

Праект прызначаны для студэнцкай моладзі. На працягу амаль двух месяцаў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Маладзёжнага парламента будуць сустракацца са студэнтамі ўсіх факультэтаў ВНУ краіны. Усяго запланавана 150 такіх сустрэч.

Тэма абмеркавання — Беларусь і яе дасягненні за апошнія 30 гадоў, створаныя ў краіне ўмовы для самарэалізацыі маладога пакалення, а таксама перспектывы развіцця дадатковых сацыяльных ліфтаў і новых форм дыялогу ўлады і моладзі, падтрымка сацыяльна значных маладзёжных ініцыятыў і іншыя тэмы. Адкрыў праектны марафон **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** сустрэчай са студэнтамі Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта. Учора гасцямі філалагічнага факультэта БДУ сталі **старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Васіль ПАНАСЮК** і **член Пастаяннай камісіі па навуцы і культуры Сяргей КЛІШЭВІЧ**.

Звярнуўшыся да студэнтаў, Сяргей Міхайлавіч узняў тэму, якая хвалюе сёння ўсіх нас і сцісла ахарактарызаваў сітуацыю, якая склалася на знешніх контурах Беларусі. Ён сказаў, што Украіна, Польшча, Літва і Латвія нарошчваюць свой ваенны патэнцыял. Дэпутат падкрэсліў: пакаленне беларусаў, якое прысутнічае ў аўдыторыі, на шчасце, не ведае, што такое вайна, узброеныя канфлікты. Яны нарадзіліся ў двухтысячных і выраслі пад мірным небам. Яны і цяпер упэўненыя ў мірнай будучыні і фарміруюць на яе планы.

— Кіраўнік дзяржавы пастаянна гаворыць, што беларусы — мірныя людзі і з нашага боку пагрозы міру няма. Але калі спатрэбіцца, то і вы, і мы павінны быць гатовы аказаць супрацьдзеянне на сваёй тэрыторыі, — адзначыў ён.

Казаў Сяргей Клішэвіч і пра тое, што не варта весціся на салодкія прамовы наконт камфортнага замежнага жыцця і высокіх заробкаў там: «Вы дарослыя людзі, і хоць выбраная вамі спецыяльнасць далёкая ад лічбаў, але вы павінны разумець, што высокая заработная плата — гэта зусім не паказчык высокага дабрабыту. Трэба лічыць, якія выдаткі на гэты заробак прыпадаюць. Колькі плацяць за камунальныя паслугі, паслугі транспарту ў нас, у Беларусі, і колькі — на Захадзе».

Дзіўна тое, што прысутную на сустрэчы самую «лірычную» і практычна цалкам дзявоцкую аўдыторыю цікавілі якраз пытанні эканамічнага характару. Васіля Панасюка прасілі падрабязна расказаць аб тым, якія сродкі з бюджэту плануецца выдзеліць на сферу адукацыі, спыталі яго асабістае меркаванне і меркаванні парламентарыяў аб тым, наколькі справядліва сёння ацэньваецца праца настаўніка, папрасілі знайсці магчымасць павысіць заработную плату і выкладчыкам, якія «...аддаюць нам столькі сіл і здароўя, даюць нам столькі ведаў!».

Сустрэча дэпутатаў з моладдзю філфака БДУ атрымалася і дзелавой, і лёгкай адначасова, што і прадугледжваюць зносіны з маладзёжнай аўдыторыяй. Студэнты не проста «адбывалі» мерапрыемства, яны ўважліва і зацікаўлена слухалі, задавалі пытанні, дзяліліся сваімі думкамі.

Уражаннямі падзяліўся **студэнт першага курса філфака Арцём САЛЬКОЎ**:

— Вельмі карыснае, пазнавальнае і насычанае інфармацыяй мерапрыемства. Я гуманітарый, але ў сённяшняй размове больш зацікавіўся эканамічнымі пытаннямі. Цяпер буду больш пільна сачыць за імі — гэта ж наша будучыня.

Арцём лічыць сябе чалавекам з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, ён удзельнічае ў жыцці ўніверсітэта і факультэта, неабыякавы і да таго, што адбываецца вакол:

— Я бачу сваю краіну і моцнай, і ў той жа час вельмі прыгожай, утульнай. Яна дае нам шанц выбіраць свой шлях і ісці па ім.

Алена ВІНАГРАДАВА.

ПРА КРЭДЫТНЫЯ ГІСТОРЫІ І НЕ ТОЛЬКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У прыватнасці, у пералік крыніц фарміравання крэдытных гісторый дададзены юрыдычныя асобы, якія рэалізоўваюць тавары, работы, паслугі на ўмовах адтэрміноўкі або растэрміноўкі аплаты, а таксама спецыяльныя фінансавыя арганізацыі, якія набылі правы патрабавання па крэдытных здзелках пры сек'юрытызацыі. Пры гэтым пры фарміраванні крэдытных гісторый змогуць улічвацца звесткі аб заключаных дагаворах, якія змяшчаюць умову аб адтэрміноўцы або растэрміноўцы аплаты тавараў (работ, паслуг).

Таксама пры прадстаўленні ў Крэдытны рэгістр звестак па крэдытных дагаворах, у тым ліку на ўмовах авердрафтнага крэдытавання, дадаткова будзе прад'яўлення інфармацыі аб наяўнасці ў дагаворы ўмовы аб даванні крэдыту на рэфінансаванне.

Унесены змены ў парадак адлюстравання ў крэдытнай гісторыі звестак пра патрабаванні банка да даўжніка, якія былі яму саступлены крэдыторам па дагаворы схаванага факторынгу. Цяпер запазычанасць па гэтых патрабаваннях будзе адлюстроўвацца ў крэдытнай гісторыі даўжніка, а не ў крэдытнай гісторыі крэдытора.

Пастановай № 310 вызначаны пералік магчымых мэт для атрымання крэдытных справаздач карыстальнікамі крэдытнай гісторыі (банкамі, мікрафінансавымі і лізінгавымі арганізацыямі, аператарамі сотавай сувязі, гандлёвымі прадпрыемствамі і іншымі), а таксама тэрмін дзеяння згоды на прадстаўленне крэдытнай справаздачы ў залежнасці ад мэты.

У прынятым дакуменце таксама вызначаны парадак адклікання суб'ектам крэдытнай гісторыі (фізічнай або юрыдычнай асобай, даныя аб якой захоўваюцца ў крэдытным рэгістры), згоды на прадстаўленне крэдытнай справаздачы. Для фізічных асоб рэгламентаваны парадак устанаўлення і зняцця забароны на прадстаўленне карыстальнікам крэдытнай гісторыі іх крэдытных справаздач. Пры гэтым для карыстальнікаў крэдытнай гісторыі прадугледжана магчымасць праверкі наяўнасці такой забароны. Праверку можна будзе правесці бясплатна і без згоды суб'екта крэдытнай гісторыі.

Увага! Гэтай пастановай прадугледжана дадатковае прадстаўленне карыстальнікам крэдытнай гісторыі звестак аб запытах іншых карыстальнікаў, якія атрымалі паведамленне аб адсутнасці крэдытнай гісторыі ў суб'екта крэдытнай гісторыі. Дадзеная мера накіравана на супрацьдзеянне махлярству, пры якім у выніку «псіхалагічнай апрацоўкі» на фізічную асобу на працягу кароткага тэрміну афармляюцца крэдыты ў некалькіх банках. Таксама вызначаны парадак атрымання крэдытнай справаздачы спадчыннікам суб'екта крэдытнай гісторыі.

Акрамя таго, цяпер павялічана колькасць крэдытных справаздач, якія даюцца суб'екту крэдытнай гісторыі без выплаты ўзнагароджання. Так, бясплатна ў Нацыянальным банку можна будзе атрымаць да дзвюх крэдытных справаздач на працягу каляндарнага года, але не больш за адзін раз на папяровым носьбіце.

Унесеныя змены будуць спрыяць атрыманню больш поўнай і дакладнай інфармацыі, дамагчыся своечасовасці выканання пазычальнікамі сваіх абавязацельстваў, дазволяць ажыццяўляць больш якасную ацэнку крэдытнай рызыкі, а таксама павысяць узровень абароненасці суб'ектаў крэдытных гісторый ад ашуканскіх дзеянняў, лічаць у Нацыянальным банку краіны.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ЗША маюць намер патроіць магутнасці ядзернай энергетыкі

Злучаныя Штаты прадставілі план, паводле якога магутнасці ядзернай энергетыкі да 2050 года будуць патроены. Адбудзецца гэта ў сувязі з ростам попыту, паведамляе агенцтва Bloomberg. Згодна з дарожнай картай, ЗША плануюць забяспечыць павелічэнне ядзернай энергетычнай магутнасці да сярэдзіны стагоддзя на 200 ГВт за кошт будаўніцтва новых рэактараў, перазапуску заводаў і мадэрнізацыі існуючых аб'ектаў. У каротказтэрміновай перспектыве Белы дом мае намер увесці ў эксплуатацыю 35 ГВт новых магутнасцяў за дзесяцігоддзе. Як звяртае ўвагу Bloomberg, стратэгія можа атрымаць пастаянную падтрымку абранага прэзідэнта ЗША Дональда Трампа, які падчас перадвыбарнай кампаніі заклікаў да будаўніцтва новых ядзерных рэактараў як спосабу забеспячэння электраэнергіяй цэнтраў апрацоўкі даных і заводаў, якія маюць патрэбу ў энергіі. Попыт на ядзерную энергетыку расце, паколькі краіны імкнуцца паскорыць укараненне крыніц энергіі з нізкім узроўнем выкідаў, а таксама ў выніку росту спажывання электраэнергіі энергаёмістымі галінамі прамысловасці, у тым ліку апрацоўку даных для штучнага інтэлекту.

Іспанія аштрафавала еўрапейскіх лаўкастараў на 179 мільёнаў еўра

Пяць бюджэтных авіякампаній — Ryanair, EasyJet, Vueling, Norwegian Air і Volotea — былі аштрафаваны за парушэнне правоў спажыўцоў. Падставай сталі даплаты, якія лаўкастары патрабуюць ад кліентаў за розныя паслугі, у тым ліку ручную паклажу, выбар месца пры палёце з дзецьмі і раздрукоўку пасадачнага талона ў аэрапорце, паведаміла «Бі-бі-сі». Самы вялікі штраф — 107,8 млн еўра — атрымала ірландская кампанія Ryanair, якая з'яўляецца найбуйнейшым лаўкастарам у Еўропе і другім па аб'ёмах перавозак у свеце. Яна адной з першых стала патрабаваць даплату за ручную паклажу (такая практыка пачалася ў лістападзе 2018 года). Vueling павінна будзе заплаціць 39,3 млн еўра, EasyJet — 29,1 млн, Norwegian Air — 1,6 млн, а Volotea — 1,2 млн. Памер штрафу вызначаны ў залежнасці ад таго, наколькі сур'ёзнымі ўлады лічаць парушэнні і колькі, на іх думку, авіякампаніі зарабілі дзякуючы гэтым парушэнням.

Каля Саламонавых астравоў знайшлі вялізны карал

Падчас экспедыцыі на Саламонавы астравы навукоўцы выявілі найбуйнейшы ў свеце карал. Па памерах ён даўжэйшы за сіняга кіта, паведаміла ABC. Шырыня карала складае 34 метры, дыяметр — 32 метры, а вышыня — 5,5 метра. Гэта адпавядае плошчы пяці тэнісных кортаў. Навукоўцы заўважылі яго ў групе астравоў у правінцыі Макіра-Улава і спачатку падумалі, што гэта астанкі патанулага карабля. Аднак, апусціўшыся пад ваду, яны выявілі гіганцкую калонію каралаў, узрост якой, паводле іх ацэнак, можа складаць 300—500 гадоў. Па словах даследчыкаў, гіганцкі карал складаецца з мільярда паліпаў — невялікіх марскіх жывёл.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні родным і блізкім Алены Ігараўны ПАРЧУК, начальніка Адукацыйнага цэнтра бяспекі жыццядзейнасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, старшыні аб'яднанай арганізацыі МНС Беларускага саюза жанчын, у сувязі з яе смерцю.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць шчырыя спачуванні родным і блізкім Дзмітрыя Аляксандравіча КРАТА, галоўнага рэдактара «Народнай газеты» ўстановы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Выдавецкі дом «Беларусь сёння», у сувязі з яго смерцю.

Рэгіёны

«АПОРУ ТРЭБА ШУКАЦЬ У САМІМ САБЕ І Ў ПРАФЕСІІ»

Прыярытэты кіраўніка Гродзенскага раёна Валерыя ХЕЛСКАГА

Сёлета раён заняў дастойнае месца на абласной Дошцы гонару. У яго першае месца за высокія паказчыкі ў сацыяльна-культурным развіцці і першае месца ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці. Гродзенскі раён — традыцыйны лідар у аграпрамысловым комплексе краіны. Не першы год тут даказваюць, што аграрны сектар можа і павінен быць прыбытковым. Менавіта ад яго работы залежыць і дабрабыт раёна.

Валерый Хелскі ў інтэрв'ю газеце «Звязда» расказаў аб вытворчым патэнцыяле і асабістым алгарытме дзейнасці на пасадзе старшыні Гродзенскага раёна.

— Валерый Уладзіміравіч, чым знамянальны гэты год для хлебаробаў раёна?

— Год няпросты, іх у сельскай гаспадарцы простых не бывае, заўсёды ёсць складанасці: і фінансавыя, і кліматычныя. Прыемна, што Гродзенскі раён не страціў сваіх пазіцый, мы атрымалі збожжа разам з рапсам і кукурузай 350 тысяч тон. Атрымалі 400 тысяч тон цукровых буракоў, больш за 18 тысяч тон садавіны. Нарыхтавалі дастатковую колькасць кармоў. Гэта значны вынік. Дзве гаспадаркі сёлета занесены на рэспубліканскую Дошку гонару. Гэта СВК «Путрышкі» і «Азёры Гродзенскага раёна». Вядома, лідарам стаць няпроста, але яшчэ складаней утрымаць пазіцыі, асабліва калі паказчыкі вельмі высокія.

— Я ведаю, што Гродзенскі раён — адзін з самых паспяховых па вытворчасці малака.

— Сёлета раён перавысіць планку надояў у 10 тысяч кілаграм малака на карову. Мяркуем, што гэтая лічба будзе 10 300. Сярэдні паказчык па краіне — 6300 кілаграмаў, па Гродзенскай вобласці — 7,5 тысячы. Мы амаль на 700 галоў павялічылі дойны статак, завяршаем будаўніцтва чатырох малочнатаварных комплексаў, якія ўзводзяцца пры падтрымцы дзяржавы. Усё гэта робіцца для паляпшэння камфорту ўтрымання жывёл. Мы бачым, што былыя аб'екты, нават там, дзе адбылася рэканструкцыя, не адпавядаюць параметрам ні па мікраклімаце, ні па санітарным стане. Таму ставім задачу стварыць для жывёл больш камфортныя ўмовы, каб забяспечыць усе неабходныя параметры.

— Чым абумоўлены поспехі раёна?

— Не адкрыю чагосьці новага, калі скажу, што поспех залежыць ад работы каманды, прафесіяналізму і адказнасці ўсіх работнікаў, адданасці сваёй працы. Пры гэтым важная пераемнасць пакаленняў, моладзі, якая прыходзіць у гаспадаркі. На якасць работы ўплывае і наша мірнае асяроддзе. Мы можам спакойна жыць, працаваць, не турбавацца пра заўтрашні дзень.

— Ці развіваецца ў раёне фермерства?

— У нас на тэрыторыі раёна зарэгістравана і працуе 77 фермерскіх гаспадарак. Кожная мае сваю нішу ў розных галінах сельскай гаспадаркі: жывёлагадоўлі, раслінаводстве, вырошчванні агародніны і садавіны, дэкаратыўных раслін. Зямля практычна ўся размеркавана, надзелы невялікія, але выкарыстоўваюцца эфектыўна.

— Як развіваецца матэрыяльна-тэхнічная база ў сферы АПК?

— Без новых тэхналогій складана фарміраваць прагнозы і ўдасканальваць вытворчасць. Гэта датычыць раслінаводства, апрацоўкі глебы. Галоўнае — дабіцца зніжэння затрат, каб прадукт быў канкурэнтаздольным і даваў максімальна магчымы прыбытак. Таму гаспадаркі ў гэтым сэнсе настроены вельмі сур'ёзна. Так, у сельскагаспадарчых кааператывах імя В. Крамко і І. Сянько адышлі ад традыцыйнага ўзворвання пры сяўбе культур і замянілі новай тэхналогіяй з мінімальнай апрацоўкай глебы, што дазваляе значна эканоміць сродкі, адпаведна, і знізіць страты. Такія машыны набываюць і іншыя нашы гаспадаркі. У цэлым аднаўленне машына-трактарнага парка вядзецца няспынна. Хаця закупачныя цэны пастаянна растуць.

— Якая сфера ў раёне развіваецца больш інтэнсіўна, чым раней?

— Сёлета значны рывок зроблены, згодна з даручэннем Прэзідэнта, у дарожным будаўніцтве. На рамонт і аднаўленне дарог выдзелена ў два разы больш сродкаў, чым летась. Радуе і тое, што такая тэндэнцыя захаваецца і на будучы год. Гэта задаволіць запыты нашых жыхароў і дазволіць зрабіць дарогі яшчэ больш камфортнымі і бяспечнымі.

Штогод выконваем планы капітальнага рамонту нашага жыллёвага фонду, звяртаем увагу на сацыяльную сферу. Сёлета завяршылі ўзвядзенне будынка, дзе размешчаны раённы Дом культуры і народнай творчасці. На другі год у нас таксама амбіцыйныя планы. Плануем заняцца будаўніцтвам сацыяльнага цэнтра ў Скідзелі, капітальным рамонтам дзіцячага сада ў аграгарадку Вярцялішкі. Плануем аднавіць работы па басейне ў Абухаве. Тут вядзём работы па рамонце Дома культуры: аднавілі сцэну, набылі сучаснае абсталяванне. Ёсць задумкі стварыць у аграгарадку Абухава музей Гродзенскага раёна, дзе будзе сабраны матэрыял ад стварэння да сённяшняга дня. Маладому пакаленню важна паказаць, як ішло развіццё аднаго з самых паспяховых раёнаў краіны, хто здабываў яму славу і чаму варта ганарыцца чалавекам працы, любіць сваю прафесію і Радзіму.

— Раён уключыўся ў праграму «Адзін раён — адзін праект»?

— У рамках гэтай праграмы ў нас рэалізоўваецца прыватны праект па выпуску тары. Гэта будзе новая вытворчасць на новых плошчах, якія размясціліся на тэрыторыі СЭЗ. Тара прызначана для вырошчвання дэкаратыўных раслін. Значная частка — 80 % прадукцыі — будзе паступаць на экспарт. Мяркуецца, што праект будзе рэалізаваны ў будучым годзе.

Між тым Прэзідэнт скіроўвае на развіццё такой вытворчасці, якая садзейнічае высокаму продажу. Напрыклад, малако добра прадаецца, значыць, трэба будаваць фермы, арганізоўваць перапрацоўку гэтай сыравіны. Бачым перспектыву ў гэтым кірунку.

У Скідзелі пачынаем сур'ёзны інвестпраект — новы завод па перапрацоўцы малака, вытворчасці сыру. Магутнасць перапрацоўкі — адна тысяча тон сыравіны за суткі. Вытворчасць — адзін з самых важных аспектаў напаўнення бюджэту раёна. Будзе вытворчасць — будзе развівацца і сацыяльная сфера, і культура, і турызм.

— У Гродзенскім раёне даволі магутны турыстычны патэнцыял. Тут і знакаміты Аўгустоўскі канал, і палацавы комплекс Свяцк, які часткова прайшоў даволі маштабную рэканструкцыю. Ці ёсць прыбытак ад гэтых аб'ектаў?

— Сёння Аўгустоўскі канал — месца, якое магло б стаць турыстычнай Меккай. Паблізу і Свяцк, які нядаўна пачаў прымаць турыстаў. Мы абмяркоўвалі з губернатарам тэму развіцця канала — стварыць умовы для разнастайнага тыпу адпачынку: сямейнага, маладзёжнага, спартыўнага. Магчыма, будуць распрацаваны тыпы лакацый розных кірункаў. У сезон там працуе пракат лодак і катамаранаў, курсіруюць цеплаход, катары. Папулярныя на канале байдарачныя сплавы. Можна ўзяць на пракат веласіпед і праехацца па некалькіх «зялёных» маршрутах. Ёсць музей. Таму цяпер Аўгустоўскі канал асацыіруецца з ціхім адпачынкам. Дарэчы, сёлета, падчас фестывалю нацыянальных культур, адзначылі 200-гадовы юбілей старажытнага гідратэхнічнага збудавання. У сезон тут праходзіць нямала свят, фэстаў, спартыўных спаборніцтваў, турзлётаў.

— Пытанне асабістае. Што лічыце для сябе асабліва складаным у пасадзе кіраўніка раёна і ў чым знаходзіце апору?

— Самае складанае — гэта рабіць заўвагі работнікам, ісці на скасаванне працоўных адносін. Лічу, што ўлады давяраюць людзям, здаецца, што людзі павінны самі разумець важнасць нашай агульнай справы. Але не заўсёды так адбываецца. Магчыма, кожны лічыць, што ён самы свядомы ў сваёй справе. Іншы раз даводзіцца нагадваць па некалькі разоў, і гэта не вельмі прыемна. Таму важна, каб кіраўнік мог адмовіць такім работнікам. Разам з тым ён павінен дапамагчы тым, хто мае ў гэтым патрэбу. А вось наконт апоры — яе трэба шукаць у самім сабе і ў прафесіі. Лічу, што галоўную загартоўку я прайшоў падчас работы загадчыкам участка ў калгасе. Потым было нямала кіруючых пасад. У раёне працуе вельмі адказная і дастойная каманда. Дрэнных спецыялістаў у нас няма, гэта датычыцца не толькі сельскай гаспадаркі, але і ўсіх сфер жыцця.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота Назара ХАЛЬКО.

З нагоды

«ЗАЛІКОВЫ СТАРТ У БУДУЧЫНЮ»

У Мінску нарадзілася новая традыцыя — Дзень першакурсніка каледжа

Больш за пяць тысяч навучэнцаў сталічных устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі сабраліся днямі ў Футбольным манежы, каб весела адзначыць «Дзень першакурсніка #Каледжы Мінска — Заліковы старт у будучыню». Такое свята для маладых людзей праводзіцца ўпершыню. З гэтага часу яно стане традыцыйным для навучэнцаў беларускай сталіцы. Карэспандэнты «Звязды» далучыліся да яркага і маштабнага святкавання.

У кіраўніцтва горада заўжды цёплае стаўленне да студэнтаў каледжаў. Гэта будучыя кадры для ўсіх сфер эканомікі сталіцы і вядучых прадпрыемстваў. Памочнік Прэзідэнта Беларусі — **інспектар па горадзе Мінску Юрый ФРАЛОЎ, намеснік міністра адукацыі Кацярына ПЯТРУЦКАЯ і намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Андрэй СТРЫГЕЛЬСКІ** далі ўрачысты старт мерапрыемству, падпісаўшы сімвалічную заліковую кніжку.

«Упершыню вырашылі правесці для першакурснікаў сталічных каледжаў такое мерапрыемства, якое дазволіць ім бліжэй пазнаёміцца, пагутарыць адзін з адным, зарадзіцца добрымі эмоцыямі, — адзначыў намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Андрэй Стрыгельскі. — Нашы каледжы — гэта велізарны кадравы рэсурс для сталічнай эканомікі. Мы на гэтых людзей вельмі разлічваем, усяляк іх падтрымліваем і хочам, каб ім было камфортна атрымліваць адукацыю ў навучальных установах, асвойваць прафесіі, якія дазволяць ім стаць паспяховымі ў жыцці».

Такія святы плануецца праводзіць і ў далейшым. Так, летам для выпускнікоў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі арганізуюць маштабны выпускны, як і для выпускнікоў ВНУ. «Вы зрабілі правільны выбар, навучаючыся ў каледжах, — сказаў Андрэй Стрыгельскі. — Вы — будучыя прафесіяналы. За гады навучання атрымаеце прафесіі, якія дазволяць адбыцца ў жыцці, добра зарабляць, карміць сем'і, прымнажаць дасягненні. Ніколі не спыняйцеся на дасягнутым».

Памочнік Прэзідэнта — інспектар па горадзе Мінску Юрый Фралоў пажадаў маладым людзям поспехаў на абраным шляху, прафесійнага росту. «Упэўнены, вы здолееце захаваць тое, што створана да вас, і прымножыць гэта», — сказаў ён.

Юрый Фралоў дадаў, што гэта — найважнейшае мерапрыемства для першакурснікаў: «Яно заклікана паказаць, як кожны малады чалавек важны для краіны, наколькі ў ім зацікаўленыя. Маладыя людзі на шляху да дарослага жыцця, атрымліваюць прафесію. Яны — наша будучыня, і хто, калі не яны, зробяць краіну яшчэ мацней».

Намеснік міністра адукацыі Кацярына Пятруцкая сказала, што майстры ў каледжах гатовы навучыць моладзь усяму, што ўмеюць: «Шануйце той вопыт, які будуць вам перадаваць, ведайце гісторыю. Прыкладзіце ўсе намаганні, каб зрабіць свой унёсак у развіццё краіны», — заклікала яна.

На свята запрасілі таксама прадстаўнікоў арганізацый — заказчыкаў кадраў. Для іх такое мерапрыемства — магчымасць пагутарыць з маладымі людзьмі, якія потым прыйдуць на практыку, увальюцца ў працоўныя калектывы. «Такое свята — выдатная магчымасць пагутарыць з навучэнцамі. Заўтра гэтыя маладыя людзі — нашы практыканты, а пасля — супрацоўнікі, далей — мэтавікі, якіх мы адпраўляем ад прадпрыемства на вучобу ў ВНУ. І для нас важна падтрымліваць іх на кожным этапе кар'ернага шляху», — сказаў **генеральны дырэктар прадпрыемства «Керамін» Дзмітрый ПЯТРУША.**

Перад гасцямі выступілі вядомыя артысты. Завяршылася мерапрыемства вялікай маладзёжнай дыскатэкай.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

ФАРМАТЫ ПАД РОЗНЫЯ ЗАПЫТЫ

СТАЛОВЫЯ, КАФЭ, РЭСТАРАНЫ

У Беларусі ёсць куды пайсці паабедаць або павячэраць: устаноў грамадскага харчавання хапае. Паводле звестак Белстата, забяспечанасць насельніцтва агульнадаступнымі месцамі ва ўстановах грамадскага харчавання на 1 студзеня бягучага года на тысячу чалавек па краіне склала 43,2 месцы пры нарматыве 42 месцы на тысячу чалавек. Нарматыў выконваецца ва ўсіх рэгіёнах, расказалі ў Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю, а ў сталіцы агульны ўзровень забяспечанасці месцамі ў рэстаранах, кавярнях, кафейнях і сталовых складае 56,9 месца на тысячу чалавек — то-бок практычна ў паўтара раза вышэй за норму. Прычым толькі сёлета прырост аб'ектаў грамадскага харчавання склаў 3,9 %, або амаль тысячу ўстаноў: у Беларусі дадаткова з'явілася 22 000 «пасадачных месцаў».

Такім чынам, усяго ў краіне працуе (па стане на 1 лістапада) 25,9 тысячы аб'ектаў грамадскага харчавання, адзначыла **начальнік аддзела метадалогіі ўпраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання МАРГ Ірына ШПАК**. З іх большая частка — сталовыя (у тым ліку пры прадпрыемствах і ўстановах), іх каля 4,5 тысячы. На другім месцы — кавярні (3,4 тыс.) Далей (па меры памяншэння колькасці) ідуць міні-бары (каля 2,5 тыс.), бары (каля 1800), кафейні (прыкладна 1400), кафетэрыі (1387). І апошнімі ў гэтым спісе ідуць рэстараны — іх у краіне 778. Плюс каля 260 перасоўных аб'ектаў грамадскага харчавання — фудтракаў.

У ТОПЕ — ФАСТ-ФУД

Ну, а прырастае галіна — і гэта маштабная тэндэнцыя, якая назіраецца ў сферы грамадскага харчавання ў апошнія некалькі гадоў, адзначаюць у МАРГ, — аб'ектамі хуткага абслугоўвання.

— Назіраецца пакупніцкі попыт на зручныя хуткія фарматы абслугоўвання: пачынаючы з 2019—2020-х гадоў (час каранавіруса) насельніцтва патрабуе паслуг па досыць таннай цане, хутка і пажадана з магчымасцю дастаўкі страў дадому, — адзначыла спецыяліст. — Адпаведна, найбольш актыўна развіваюцца аб'екты хуткага абслугоўвання: піцэрыі, блінныя, бургерныя, якія працуюць або з уласнымі таварнымі знакамі, або па франчайзінге.

Усяго ў краіне каля 119 тысяч месцаў менавіта ў такіх установах, толькі сёлета прырост склаў тры тысячы месцаў. Зрэшты, забягаючы наперад, скажам: здольныя сёння нашы суграмадзяне ацаніць і ўстановы не «хуткай», а «павольнай» ежы, для гурманаў, адзначаюць спецыялісты сферы грамадскага харчавання. Дарэчы, яшчэ адна тэндэнцыя, якая з'явілася некалькі гадоў таму на хвалі цікавасці да гастратурызму, — установы, якія спецыялізуюцца на беларускай кухні. Іх на сёння ў краіне 238: з менш ці больш аўтэнтычнымі рэцэптамі ў меню, тэматычным афармленнем інтэр'ера і беларускім каларытам. Фестываляў і дзён беларускай кухні за першае паўгоддзе 2024-га яны правялі вельмі шмат. Калі дакладна, то 199, паведамілі ў МАРГ.

Словам, канкурэнцыя ў сферы грамадскага харчавання вялікая, але спажыўцу гэта толькі на карысць — мноства фарматаў і канцэпцый пад розныя запыты. А вось установе харчавання ў такой сітуацыі важна знайсці сваё асаблівае месца сярод канкурэнтаў. Заўважым, што любы рэстаран (кавярня ці нават сталовая) — гэта не сцены, «фармат» і нават не «кухня». У першую чаргу гэта людзі, да якіх наведвальнікі хочуць ці не хочуць «прыходзіць у госці». Кадры, прафесіяналізм якіх і вызначае, ці вернецца ў гэтыя сцены госць, ці да спадобы яму фармат установы і ці захоча ён зноў каштаваць яе стравы.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

КАРМІЦЬ БУДУЦЬ СМАЧНЕЙ?

Выдзяляцца за кошт яркага інтэр'ера, цэнавай палітыкі, цікавых акцый і смачнай кухні — відавочныя спосабы выгадна прадставіць установу на фоне канкурэнтаў. Але ёсць і яшчэ адзін шырока вядомы ў гэтай сферы шлях — удзел у прафесійных конкурсах і чэмпіянатах. Адзін з якіх — Міжнародны кулінарны кубак — 2024 — адбыўся ў Мінску ў дні правядзення выставы «Прадэкспа». І для кухара са стажам (а таксама для ўстановы, якую ён прадстаўляе), і для пачаткоўца гэта магчымасць расказаць аб сабе новай аўдыторыі, убачыць напрацоўкі калег і, магчыма, здабыць сярод гледачоў прыхільнікаў яго кулінарнага таленту.

Кубак-2024 меркаваў розныя фарматы і намінацыі. Канкурсанты ў рэжыме рэальнага часу пад поглядамі шматлікай аўдыторыі гледачоў гатавалі стравы з мяса, птушкі, рыбы, беларускую кухню, дэсерты. Прайшоў конкурс сярод шэфаў «Брыльянтавы каўпак», камандныя спаборніцтвы і «Чорная скрыня», дзе са спантаннага (невядомага канкурсантам да адкрыцця скрыні) набору прадуктаў у мінімальныя тэрміны трэба было прыгатаваць нешта не проста ядомае, а смачнае-карыснае, здзівіўшы суддзяў знаходлівасцю і крэатывам. Апроч батла шэфаў і су-шэфаў, спаборнічалі паміж сабой таксама студэнты і выпускнікі профільных навучальных устаноў.

— На Кулінарным кубку сёлета прыкметны значны рост майстэрства, — падзяліўся ўражаннем **кіраўнік Гільдыі повараў і шэфповараў Беларусі Аляксандр ЧЫКІЛЕЎСКІ**. — Я маю на ўвазе не прафесіяналаў, якія заўсёды працуюць якасна, а навучэнцаў з вучылішчаў і каледжаў. Яны зрабілі вялікі крок наперад: ужываюць сучасныя тэхнікі, вынаходзяць новыя смакі, выкарыстоўваюць цікавыя афармленні на талерцы. Ёсць работы мацнейшыя ці слабейшыя, але дынаміка росту відавочная, і гэта выдатна.

— З чым звязаны гэты рост?

— Сёння дастаткова інфармацыі ў дапамогу і выкладчыкам, і навучэнцам, і маладым спецыялістам, якія хочуць развівацца ў прафесіі. Можна знайсці шмат цікавых страў, смакавых спалучэнняў. Калі я вучыўся, акрамя «Зборніка смачнай і карыснай ежы» і «Зборніка рэцэптур» інфармацыі практычна не было — далей можна было фантазіраваць. Цяпер і інфармацыі шмат, і фантазія практычна бязмежная. Галоўнае — ведаць меру, каб у выніку страва была ядомая... Выбіраюць, што гатаваць на конкурсе, удзельнікі самі, за пэўны час — 45 хвілін — яны павінны паказаць сваё майстэрства. Гатуюць канкурсанты ў рэжыме рэальнага часу, у боксах. Беручы ўдзел у конкурсе, лепш абраць некалькі намінацый. Я сам, калі ездзіў на кулінарныя конкурсы і алімпіяды, у тым ліку міжнародныя, выступаў як мінімум у чатырох намінацыях. Гэта велізарны вопыт: ты заходзіш у бокс без страху, ведаеш, што будзеш рабіць, — і спакойна робіш. А калі канкурсант выступае ўпершыню, заўсёды бачна, як ён хвалюецца: рукі трасуцца. Навічку не проста абстрагавацца ад гледачоў і суддзяў і засяродзіцца на страве.

«ШЭФ-ШТОПАР», «ШЭФ-КВАКТУХА»...

— А ў цэлым, што адрознівае добрага повара ад, скажам так, не вельмі добрага?

— Добрага повара адрознівае наяўнасць густу: ён павінен разумець, куды, колькі і ў які момант дадаць солі, перцу... «Смакавікоў» цяпер мала — прафесіяналаў, здольных зразумець гэты баланс паміж перцам-соллю-цукрам, тымі ці іншымі спецыямі.

— Чаму?

— Наш смак сапсаваны рознага роду дабаўкамі. Сучасны чалавек з дзяцінства прывыкае да агрэсіўных хімічных смакаў... І яшчэ я заўважыў на конкурсах і чэмпіянатах: маладыя ўдзельнікі, і гэта іх вялікая памылка, не каштуюць страву, якую гатуюць. Хоць для гэтага ў боксах прадугледжаны спецыяльныя лыжкі, якія моладзь не выкарыстоўвае. Шэфы і кухары са стажам (дарослыя канкурсанты) каштуюць страву абавязкова, на розных этапах. А моладзь гэтага не робіць... Учора быў прэцэдэнт: адна страва аказалася перасоленай, у другой быў відавочны недахоп спецый.

— Вернемся да пытання аб добрым кухары...

— Прафесіянал умее дакладна выконваць на кухні распараджэнні шэфа, і ён заўсёды на пазітыве. Кухар з дрэнным настроем гатаваць не павінен, таму што ваш настрой перадаецца ў страву, якую вы падасце людзям. Ніякай містыкі тут няма. У старажытнасці на Усходзе кухары былі таксама і лекарамі, яны лячылі ежай.

— Але ж у жыцці бывае ўсякае, а на працу мы ходзім кожны дзень. Немагчыма быць у добрым настроі, як кажуць, 24 на 7. Што рабіць?

— Усміхацца і радавацца жыццю — часам напачатку нават намаганнем волі. Мы ж, кухары, гатуем ежу, а гэта — вялікая адказнасць. Зразумела, быць у добрым настроі не заўжды атрымліваецца. Тым не менш трэба імкнуцца.

— Ну, а добры шэф-повар — што гэта за прафесіянал?

— Гэта вельмі шматграннае паняцце. Шэфы бываюць розныя. Напрыклад, шэфы, якія любяць гатаваць, але ў іх блытаніна з паперамі. Ці тыя, хто засяроджваецца на кіравальных момантах, а кухняй у такога шэфа займаецца су-шэф. На прафесійным слэнгу ёсць шэфы-«штопары», «канібалы», «зоркі»... «Штопар» — гэта шэф, які арыентаваны на адкрыццё рэстарана, стварэнне брэнда і ідэальны менавіта ў гэтым. Ён адкрывае ўстанову, прадумвае канцэпцыю, клапоціцца аб прыцягненні наведвальнікаў. «Канібал» — гэта шэф-повар, якога можна назваць таксама «антыкрызісным менеджарам». Ён асабліва эфектыўны ва ўстановах, што прыйшлі ў заняпад: у яго атрымліваецца паднімаць іх «з руін». Такі шэф замяняе стары склад (нібыта «з'ядае» яго), выкідвае непатрэбнае, усё мяняе — і ўстанова становіцца прывабнай для гасцей. Стыль шэфа-«канібала» паказаны ў праграме «На нажах». Ёсць яшчэ шэф-«квактуха». Ён любіць менавіта сваю ўстанову, клапоціцца аб ёй і больш нічога не хоча адчыняць ці пашыраць. У яго ва ўстанове ўсё працуе (і ўсе працуюць) дакладна, але ён лічыць, што няма мяжы дасканаласці, — і гэтай дасканаласці сапраўды дасягае. І ёсць шэф-«зорка», які прасоўвае свой рэстаран за кошт уласнага таленту і харызмы: выбіраючы яго ўстанову, наведвальнікі прыходзяць «у госці» менавіта да яго. Прыходзяць на вячэру як на канцэрт любімага акцёра.

«У НАВЕДВАЛЬНІКА ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫБАР»

— Такім чынам, каб гатаваць ежу, кухару патрэбныя добры настрой і спакой. Але ж кулінарны конкурс (як і любое мерапрыемства, дзе ёсць момант спаборніцтва) — гэта стрэс...

— Удзел у конкурсах якраз і адточвае навык працаваць у стрэсавай сітуацыі. Для повара гэта важна. На кухні стрэс пачынаецца з 9 гадзін раніцы, і гэта нармальна. Але з гэтым стрэсам трэба ўмець спраўляцца. Акрамя таго, удзел у кулінарных конкурсах дазваляе трэніраваць «нагледжанасць», што таксама неабходна ў нашай прафесіі: якія тэхнікі выкарыстоўваюць калегі, як гатуюць і як падаюць? Сёння кулінарыя развіваецца вельмі хутка. Я 35 гадоў на кухні, але вучуся да гэтага часу, у тым ліку ў маладых кухараў. Новыя тэндэнцыі цяпер з'яўляюцца пастаянна, таму нават для вопытных повараў так важна ездзіць на прафесійныя конкурсы, вучыцца, глядзець.

— Але ці здольныя наведвальнікі ацаніць усе гэтыя вытанчаныя кулінарныя тэхнікі? Улічваючы існуючы ў грамадстве запыт на ўстановы хуткага харчавання...

— Вядома, здольныя! Сёння госць у беларускіх рэстаранах мяняецца. Людзі ездзяць па розных краінах, бываюць у розных установах, часам і з высокай кухняй. Яшчэ гадоў дзесяць таму можна было сказаць, што беларускія госці рэстаранаў і кавярань чагосьці не ведаюць. Цяпер наведвальнікі звяртаюць увагу і на смак, і на падачу. Госці ж таксама развіваюцца, і гэта выдатна, што мы — і кухары, і наведвальнікі — развіваем адзін аднаго. Дарэчы, нашы суграмадзяне дастаткова часта ходзяць не толькі ў піцэрыі і іншыя фаст-фуд-установы, але і ў рэстараны — вечарам у пятніцу, суботу і нядзелю ў Мінску і абласных цэнтрах не так проста без папярэдняй броні знайсці столік. Так што беларусаў цікавіць не толькі хуткае харчаванне.

— А якой цэнавай катэгорыі рэстаранаў і кавярань аддаюць перавагу наведвальнікі ў нашай краіне, па вашых назіраннях?

— Тут складана сказаць нешта агульнае. Я, напрыклад, калі сам хаджу ў рэстаран, хачу, каб цэны там былі не надта высокія. Але калі кухар выкарыстоўвае дарагія прадукты, кошт стравы апрыёры не можа быць нізкім. Вядома, цана будзе невысокая, калі каштоўнага прадукту ў страве пяць грамаў, але які тады ў гэтым сэнс? Сёння ў нашай краіне шмат рэстаранаў з сярэдняй цэнавой палітыкай, і гэта нядрэнна. Але павінна быць пэўная колькасць і дарагіх устаноў, і прастых, але ўтульных кафэ з добрай кухняй. У любога госця павінны быць выбар, магчымасць атрымаць задавальненне ад смачнай ежы і прыемнай атмасферы.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ГІСТАРЫЧНЫЯ АСОБЫ ЖУРФАКА

Факультэт журналістыкі БДУ адзначыў 80-годдзе

Калектывізм, руплівасць, адказнасць — такую традыцыю заклалі ў аснову журфака яго ўвішныя дэканы пасля ўзнаўлення ў 1968 годзе функцыянавання самастойнай акадэмічнай структуры ў БДУ. Галоўным архітэктарам і будаўніком стаў ініцыятар самастойнасці журфака Рыгор Булацкі (1968—1981). Калектыў камплектаваў, падбіраў, расціў сістэмна і прадбачліва: па ініцыятыве Рыгора Васільевіча на факультэце пачала працаваць вялікая плеяда вядомых журналістаў-практыкаў, што ўзначалілі чатыры кафедры і стварылі руплівы цэнтр падрыхтоўкі і выхавання журналісцкіх кадраў: Мікалай Дастанка, Яўген Радкевіч, Міхаіл Цікоцкі, Барыс Стральцоў...

Сустрэча калектыву факультэта журналістыкі БДУ з ветэранамі журфака. 1 лістапада 2024 г.

ТРАНСФАРМАЦЫЯ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСУ І НАВУКОВАЯ ШКОЛА

Ключавым фактарам і каталізатарам самаўдасканалення журфака з'явілася адкрыццё пяці новых кафедр: у 1998 г. — сацыялогіі журналістыкі, перыядычнага друку, літаратурна-мастацкай крытыкі, у 1999 г. — тэхналогій камунікацыі і англійскай мовы і моўнай камунікацыі. Дзейсным сродкам згуртавання педагагічнага калектыву і рацыянальнай «прышчэпкай» ад спарадычных праяў «хутарскіх абміцый» у інтэлігентным асяроддзі стала ўкараненне пяці новых разгалінаваных спецыяльнасцяў — «Інфармацыя і камунікацыя», «Аўдыявізуальная журналістыка», «Друкаваныя СМІ», «Літаратурная работа», «Міжнародная журналістыка».

Павышэнню эфектыўнасці тэхналагічнай і метадычнай дзейнасці калектыву спрыяў створаны «з нуля» вучэбны цэнтр камунікацыйных тэхналогій. Упершыню былі створаны беларускія адукацыйныя стандарты, вучэбныя планы і праграмы для двухузроўневай падрыхтоўкі профільных кадраў. Нарэшце ўдалося замацаваць за журфакам права творчага адбору абітурыентаў праз сістэму профільных іспытаў і рэдакцыйныя алімпіяды ў маладзёжных выданнях. Закладзена аснова сістэмнай мадэлі павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі супрацоўнікаў інфармацыйнай галіны. Першым у краіне журфак распрацаваў і ўкараніў рэйтынгавую сістэму бягучай паспяховасці студэнтаў.

Спадкаемцы атрымалі ад пакалення выкладчыкаў пачатку XXI стагоддзя шмат доўгатэрміновых напрацовак і пачынанняў. Суцэльнафрантальнае рэфармаванне журналісцкай адукацыі ў краіне на мяжы тысячагоддзяў было выкліканa самім жыццём, пераўтварэннямі ў сацыяльным, палітычным жыцці беларускага грамадства. Трансфармацыю вучэбна-метадычнага працэсу ажыццяўляў літаральна ўвесь калектыў журфака. Асноўны цяжар гэтай самакрытычнай і мэтанакіраванай работы вынес «штаб» намеснікаў дэкана, новы склад загадчыкаў кафедр — А. К. Свораб, Л. П. Саянкова, В. Р. Булацкі, Т. М. Дасаева, В. Р. Вашкевіч, П. Л. Дарашчонак, І. Ф. Ухванава.

Журналісцкія будні і навуковы пошук выявілі патрэбу насычэння класічнага ўніверсітэцкага навучання журналістаў дысцыплінамі сацыяльна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, сацыяльна-псіхалагічнага, прававога, тэхналагічнага профіляў, збалансаваных з філалагічнай і гістарычнай падрыхтоўкай. Шэраг новых дысцыплін, уведзеных у вучэбны план, арыентаваны на выхаванне ў журналістаў-пачаткоўцаў трывалых навыкаў аб'ектывацыі фактаў жыцця ў палітычным, эканамічным, псіхалагічным кантэксце рэчаіснасці.

Дынамізм навуковай сферы факультэта характарызаваўся не толькі аб'ёмам і якасцю навуковых прац, але і тэмпам кваліфікацыйнага сталення. Гэта дазволіла ўпершыню ў гісторыі журфака стварыць «доктарскі» савет па абароне дысертацый, што, у сваю чаргу, стымулявала паспяховую абарону чатырох доктарскіх дысертацый, вельмі чаканых пасля 15-гадовага тайм-аўта. Закладзена яшчэ адна трывалая перспектыўная традыцыя — правядзенне міжнародных навукова-практычных канферэнцый. Створаны ўмовы для штогадовага абагульнення міжнароднага і нацыянальнага вопыту журналісцкай тэорыі і практыкі. Гэта дазваляла аб'ектыўна асэнсоўваць сацыяльна-культурны статус журналістыкі і перспектывы яе развіцця.

НЯСТОМНАЯ ПАДЗВІЖНІЦА

Замацаванне і развіццё трывалых традыцый журфака трымалася таксама на постацях легендарных асоб выкладчыкаў журфака. На двух прозвішчах спынімся асобна.

Нястомная падзвіжніца — менавіта з гэтымі словамі асацыіруецца постаць прафесара, доктара філалагічных навук, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, знакамітага кінакрытыка і заснавальніцы беларускай школы кінадаследчыкаў, выпускніцы журфака першага склікання Ефрасінні Леанідаўны Бондаравай. Такой засталася ў памяці сваіх выхаванцаў і калег па выкладчыцкім цэху шаноўная і непаўторная, прынцыповая і рашучая, уважлівая і лагодная Ефрасіння Леанідаўна.

Прафесар журналістыкі ўсе гады сваёй нястомнай і высакароднай працы ва ўніверсітэце з'яўлялася генеральным канструктарам студэнцкага навуковага таварыства, дзейсным арганізатарам даследчыцкай школы роднага факультэта. Не проста была кураторам, не проста выконвала функцыю адказнага выканаўцы па кіраванні студэнцкімі гурткамі і навукова-практычнымі канферэнцыямі, а штодзённа жыла натхненнем студэнцкай творчасці.

Прадбачлівасць Ефрасінні Леанідаўны ў пошуку даследчыцкіх талентаў сярод студэнцкай моладзі ўражвала. Праз дзесяцігоддзі яе характэрная рыса пранікнёнага прагназіста чалавечых лёсаў знайшла пераканаўчы гістарычны доказ і пацверджанне. Студэнцкі кіраўнік журфакаўскага навуковага таварыства Саша Астроўскі стаў цудоўным рэдактарам першага ў былым Саюзе шматпалоснага штотыднёвіка, а потым — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў шэрагу краін Еўропы, Генеральным консулам у ЗША. Місіянерская настаўніцкая душа Ефрасінні Леанідаўны падарыла журфаку шэраг прыгажунь-разумніц, якіх яна выпеставала ў навуковых гуртках, а затым вырасціла ў таленавітых выкладчыкаў і даследчыкаў журналістыкі — Таццяну Чыгрынаву, Таццяну Падаляк, Людмілу Саянкову, Вольгу Мядзведзеву... Пералічваць імёны-зоркі, што запаліла Ефрасіння Леанідаўна, можна бясконца. Важкі і незабыўны ўнёсак няўрымслівай Ефрасінні Бондаравай у скарбонку талентаў журфака, беларускай кінакрытыкі, журналістыкі працягваюць узгадаваныя ёю вучні.

Не забываюцца, а крышталізуюцца і становяцца больш выразнымі, рэльефнымі і красамоўнымі па шчырасці і чалавечнасці яе простыя асобасныя ўчынкі. Пасля чарговай студэнцкай канферэнцыі, якую даручыла адкрываць Ефрасіння Леанідаўна, яна прылюдна на прэзідыумнай трыбуне ўручыла звычайную духмяную сушку-абаранак... Маўляў, на «абаранкі не атрымаеш», бо здолеў правесці пленарнае пасяджэнне студэнцкай канферэнцыі журфака як след: па яе высокіх стандартах. Даражэй гэтага падарунка-сімвала з рук аўтарытэта для мяне — тагачаснага трэцякурсніка журфака і кіраўніка савета СНТ — нічога не было. Бо гэта сімвалізавала прызнанне самой Ефрасінні Леанідаўны і цанілася вышэй грамат і значкоў.

А літаральна праз год-паўтара прафесар на імпрэзе ў культавым для журфака з бласлаўлення Ефрасінні Леанідаўны Доме кіно запрасіла на кубачак кавы. Тады здалося, што багіня мудрасці і шчырасці адарыла шчаслівым білетам на ўсе экзамены жыцця. Без лішніх слоўных канструкцый вынесла вердыкт: «Ведаю, што сябруеце, таму далейшая даследчыцкая сцяжынка ў цябе побач з Барысам Васільевічам».

Прысуд яе стаў прароцтвам. І наказам. І бласлаўленнем. Такая бескарыслівая дапамога-парада не забываецца. Невыпадкова ўдзячныя вучні Ефрасінні Леанідаўны адкрылі яе імянную аўдыторыю побач і насупраць імянной аўдыторыі Б. В. Стральцова. Два знакамітыя журфакаўскія настаўнікі назаўсёды прапісаны побач. Гэтак жа ішлі і па жыцці: па журналісцкім, даследчыцкім, настаўніцкім, асобасным і маральным кірунках.

СВЯТЛО МАРАЛЬНАСЦІ І КАМПЕТЭНТНАСЦІ

Стваральнай асобай і прыцягальным прафесіяналам застаўся навечна ў летапісе факультэта журналістыкі Барыс Васільевіч Стральцоў. Пуцявіны лёсу творцы па жыцці абудзілі ва ўчарашнім армейцы смак да беларускага слова і журналістыкі. Набываючы завочна адукацыю ў БДУ, Барыс Васільевіч загартаваў прафесійныя кампетэнцыі журналіста ў газетным горне раённай і маладзёжнай газет, газеты «Звязда».

Змястоўная, глыбокая кандыдацкая дысертацыя ў манаграфічным аздабленні «Газета і мараль» падштурхнула Б. В. Стральцова да новай прыступкі і місіі ў жыцці — настаўніцтва. З 1967 года ён паслядоўна становіцца спачатку дацэнтам, загадчыкам кафедры. Настаўнік ад Бога і сейбіт разумнага, добрага, вечнага па вопыце журналісцкіх будняў на чатыры дзесяцігоддзі звязаў свае жыццё з БДУ. Маральныя каштоўнасці, што абараняў і папулярызаваў Б. В. Стральцоў у журналістыцы, у студэнцкім асяроддзі, не выцвілі ад часу ні ў кандыдацкім даследаванні, ні ў шматлікіх вучэбных дапаможніках і навуковых артыкулах. Рэфрэнам праз яго навуковую, педагагічную і публіцыстычную дзейнасць праходзіць думка, што «журналістыка — гэта лад жыцця». Сучаснасць пацвердзіла трываласць меркавання Настаўніка і для сённяшняга дня: толькі ў суладдзі з жыццём журналістыка валодае стваральным патэнцыялам.

Даследчык па перакананні, Барыс Стральцоў спаўна рэалізаваў сваю творчую здольнасць у доктарскім даследаванні праблем мадыфікацыі прадмета і функцый журналістыкі ў жанравых формах. Стральцоўская сістэма інфармацыйных, аналітычных і мастацка-публіцыстычных жанраў журналістыкі запатрабавана і сёння ў акадэмічных колах, сярод журналістаў-практыкаў. Даследаванне на дзесяцігоддзі пражыло вучонага. Але засталася памяць пра цудоўнага чалавека, асобу, прафесіянала, творцу, журналіста, настаўніка, даследчыка, вучонага, доктара філалагічных навук, прафесара, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь.

Школа Барыса Стральцова — школа майстра. Яго даследчыцкая спадчына вельмі багатая і даволі разнастайная па кірунках і праблематыцы. Спрычыненасць навукова-даследчага азімуту дзенняў Б. В. Стральцова жыццёва-прафесійным сталеннем асобы не выклікае сумненняў. Літаратурны супрацоўнік тагачаснай бабруйскай абласной газеты «Савецкая Радзіма», літработнік, загадчык аддзела рэдакцыі газеты «Чырвоная змена», літаратурны супрацоўнік, загадчык аддзела літаратуры і мастацтва газеты «Звязда». З 1951 да 1969 года ён валадарыў паміж «молатам» рэдакцыйных заданняў і «накавальняй» творчых памкненняў у журналісцкім цэху і літаратурнай ніве.

Практыкаарыентаванай стратэгіяй Б. В. Стральцова у 70—80 гады XX стагоддзя быў прадыктаваны выхад манаграфічных даследаванняў «Публіцыстычнасць інфармацыйных жанраў», «Аналітычныя жанры», «Публіцыстыка. Жанры. Майстэрства». На іх аснове была абаронена доктарская дысертацыя «Праблемы мадыфікацыі функцый і прадмета публіцыстыкі ў газетных жанрах». Гэта дазволіла ўвесці ў вучэбны працэс журфака аж пяць самастойных, але лагічна ўзаемазвязаных узаемаразвіццёвых дысцыплін, якія закладваюць падмурак прафесійнага творчага сталення студэнтаў. Гэтым і тлумачыцца неўміручая памяць выпускнікоў пра Настаўніка.

Натуральна, што пасля паспяховых даследчыцкіх і рацыянальных вучэбна-метадычных учынкаў (змены тыпавога плана навучання ў Савецкім Саюзе — гэта сапраўды мужны стральцоўскі ўчынак!) загадчык кафедры тэорыі практыкі савецкай журналістыкі БДУ змог рэалізаваць наступную высакародную задумку — стварэнне даследчыцкай школы. Пільная ўвага Б. В. Стральцова да працэсу развіцця здольных студэнтаў, падбор, замацаванне іх у даследчай майстэрні грунтаваліся на светапоглядным прынцыпе — наяўнасць абавязковага практычнага журналісцкага вопыту. Сістэмныя захады неўзабаве прынеслі і плён.

Пад кіраўніцтвам прафесара Б. В. Стральцова былі абаронены шматлікія кандыдацкія дысертацыі. Дыяпазон тэм і кірункаў даследавання поліфункцыянальнай прыроды журналістыкі аб'яднаны асобай кіраўніка — Б. В. Стральцова. Яго бачанне перспектыў развіцця сродкаў масавай інфармацыі і практыкаарыентаваная мэтазгоднасць навуковага асэнсавання дыктавалі падбор вопытных практыкаў з розных выданняў і фарміраванне беларускай даследчай школы журналістыкі.

На рубяжы стагоддзяў прафесар Б. В. Стральцоў узначаліў спецыялізаваны Савет па абароне доктарскіх дысертацый у галіне журналістыкі. Упершыню ў гісторыі журфака з'явілася магчымасць калектыўнай падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Гэтую магчымасць Б. В. Стральцоў бліскуча рэалізаваў на карысць журфака і журналісцкай навукі Беларусі. Чатыры дактары навук і дваццаць адзін кандыдат навук выпеставаныя з лёгкай рукі і з рэдактарска-кансультатыўным удзелам Барыса Васільевіча. Яны і сёння вызначаюць даследчы патэнцыял інфармацыйнай галіны ведаў Беларусі.

Каб быць паходняй, трэба свяціць. Гэтага прынцыпу Барыс Васільевіч прытрымліваўся ўсё сваё жыццё. Ён заклікаў журналістаў да прафесійнага, кваліфікаванага, творчага ўдасканалення інфармацыйнай прасторы Беларусі.

Васіль ВАРАБ'ЁЎ,
прафесар кафедры медыялогіі факультэта журналістыкі БДУ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

27 лістапада 2024 г. № 45 (778)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

«НАША КРАІНА, АКРАМЯ СЯБЕ, МОЖА НАКАРМІЦЬ ЯШЧЭ ДЗВЕ З ПАЛОВАЙ БЕЛАРУСІ»

На Прэзідыуме Савета Рэспублікі гаварылі аб харчовай бяспецы на прыкладзе аднаго асобна ўзятага прадпрыемства

У аўторак на базе ААТ «Салігорская птушкафабрыка» пад кіраўніцтвам Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ прайшло выязное пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі. Удзельнікі абмеркавалі пытанні дзейнасці птушкафабрыкі і перспектывы яе развіцця, а таксама пашырэння рынкаў экспарту беларускіх прадуктаў харчавання. Затым парламентарыі ўзялі ўдзел у адкрыцці першай чаргі інавацыйнай перапёлкавай фермы замкнёнага цыклу, азнаёміліся з работай прадпрыемства і адказалі на пытанні яго супрацоўнікаў. Карэспандэнт «Звязды» таксама далучыўся да цікавай камандзіроўкі.

Паглядзець на месцы, як дабіцца поспеху

Салігорская птушкафабрыка для правядзення мерапрыемства была абрана невыпадкова. **Дырэктар прадпрыемства Іна ТАЛКАЧОВА** з'яўляецца членам Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве. «Мы дамовіліся, што будзем праводзіць такія выязныя пасяджэнні, наведваючы тыя арганізацыі і прадпрыемствы, дзе працуюць члены Савета Рэспублікі. Яны працуюць у розных установах, арганізацыях і прадпрыемствах нашай краіны, а разам з тым яшчэ і выконваюць сур'ёзную функцыю — прадстаўляюць кожны свой рэгіён», — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава.

На парадак дня было вынесена пытанне аб дзейнасці прадпрыемства і перспектывах яго развіцця. «Мы з вамі ведаем, як правільна шмат гадоў таму было прынята рашэнне Прэзідэнтам нашай краіны аб развіцці сельскай гаспадаркі, — акцэнтавала Наталля Качанава. — Сёння наша краіна дасягнула сур'ёзных вынікаў у гэтым кірунку эканомікі. Наша краіна, акрамя сябе, можа накарміць яшчэ дзве з паловай Беларусі, забяспечыць якаснымі прадуктамі харчавання, якія сёння карыстаюцца папулярнасцю. А пра якасць беларускіх прадуктаў харчавання ведаюць далёка за межамі нашай краіны».

Па словах спікера Савета Рэспублікі, Салігорская птушкафабрыка з'яўляецца адной з тых, якія сёння ў сегменце па вытворчасці яек займаюць вядучыя пазіцыі. «Гэта не проста вытворчасць яек. Гэта яшчэ і новыя віды прадукцыі, вельмі карысныя і патрэбныя для харчавання нашых грамадзян і, што немалаважна, дзіцячага харчавання».

Салігорская птушкафабрыка — адзін з прызнаных лідараў птушкагадоўчай галіны: штогод тут вырабляюць 354 мільёны курыных і 120 мільёнаў перапёлчыных яек. Што датычыцца апошніх, у найбліжэйшы час іх выпуск плануюць павялічыць у некалькі разоў. Пра гэта распавяла яе дырэктар Іна Талкачова.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Сустрэчы ў калектывах, дыялогавыя пляцоўкі, прыём грамадзян

Работа з людзьмі — галоўны прыярытэт у дзейнасці сенатараў на месцах

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Андрэй ЖАМОЙДА сустрэўся з працоўным калектывам Лідскага цэха ўнітарнага прадпрыемства «Гроднаўтарчэрмет».

Галоўнай тэмай сустрэчы сталі маючыя адбыцца выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія пройдуць у краіне 26 студзеня 2025 года. Сенатар растлумачыў асноўныя палажэнні выбарчага заканадаўства, расказаў аб прававых асновах назначэння і правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Падчас дыялогу абмяркоўваліся роля палітычных партый у перыяд электаральнай кампаніі і грамадска-палітычная сітуацыя ў краіне.

***

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Глеб ЛАПІЦКІ ўзяў удзел у дыялогавай пляцоўцы з удзелам актыву пажылых грамадзян і моладзі Талачынскага раёна ў рамках рэспубліканскай акцыі «За Беларусь адзіную!». Акцыя стартавала ў Талачыне і пройдзе ў 30 рэгіёнах па ўсёй краіне. Яе асноўнымі мэтамі з'яўляюцца ўмацаванне адзінства і згуртаванасці беларускага народа і падтрымка культурнай ідэнтычнасці.

У рамках дыялогу маладыя людзі актыўна цікавіліся работай над праектам Кодэкса аб ахове здароўя, тэрмінамі яго прыняцця і чаканымі зменамі ў сістэме медыцынскага абслугоўвання. Сенатар адказаў на ўсе пытанні, падкрэсліўшы, што вядзецца актыўная работа над праектам Кодэкса, адзначыў шматаспектнасць задачы, якая патрабуе ўважлівай прапрацоўкі ўсіх дэталяў, каб заканадаўства адлюстроўвала сучасныя выклікі і забяспечвала даступнасць якаснай медыцынскай дапамогі для ўсіх грамадзян.

Прадстаўнікі старэйшага пакалення выказалі сур'ёзную занепакоенасць наконт распаўсюджвання вейпінгу сярод моладзі, што негатыўна адаб'ецца на здароўі падрастаючага пакалення, і зрабілі прапанову аб неабходнасці больш строгага рэгулявання гэтай сферы. Парламентарый пагадзіўся з актуальнасцю праблемы і паведаміў, што пытанні рэгулявання вейпінгу знаходзяцца ў стадыі прапрацоўкі. Глеб Лапіцкі падкрэсліў, што для прыняцця эфектыўных мер патрабуецца комплексны падыход, які ўключае як заканадаўчае рэгуляванне і ініцыятывы, так і прапаганду здаровага ладу жыцця.

***

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Наталля ГЛІНСКАЯ правяла прамую тэлефонную лінію і асабісты прыём грамадзян у Маладзечне.

Былі разгледжаны звароты грамадзян, якія датычацца змяненняў у маршруты руху гарадскога транспарту, адсутнасці тратуараў і недастатковасці асвятлення вуліц прыватнай забудовы горада, а таксама магчымасці ўнясення змяненняў у дыплом аб вышэйшай адукацыі.

Пытанні грамадзян, якія прыйшлі на асабісты прыём, былі пільна разгледжаны членамі Савета Рэспублікі сумесна з запрошанымі спецыялістамі, заяўнікам дадзены тлумачэнні і рэкамендацыі. Па асобных пытаннях намечаны шляхі вырашэння. Усе пытанні ўзяты на кантроль.

Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.

«НАША КРАІНА, АКРАМЯ СЯБЕ, МОЖА НАКАРМІЦЬ ЯШЧЭ ДЗВЕ З ПАЛОВАЙ БЕЛАРУСІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Салігорская птушкафабрыка атрымлівае больш за 90 працэнтаў усіх перапёлчыных яек, выпрацаваных у Беларусі. Па сутнасці, прадпрыемства з'яўляецца радзімай перапёлак: займацца гэтай птушкай тут пачалі больш як 20 гадоў таму — у канцы 1990-х была наладжана вытворчасць перапёлчыных яек. За гэты час аб'ём іх вытворчасці ўзрос у 500 разоў!

Па словах Іны Талкачовай, два гады таму на прадпрыемстве запусцілі новую лінію па перапрацоўцы перапёлчыных яек, што дазволіла павялічыць аб'ёмы вытворчасці прадукцыі. Усе працэсы на лініі герметычныя. Акрамя таго, больш за 50 працэнтаў адпраўляецца на экспарт: прадукцыя Салігорскай птушкафабрыкі добра вядомая жыхарам Расіі, Азербайджана, Казахстана. Акрамя таго, прадпрыемства ў працэсе атрымання акрэдытацыі на пастаўкі прадукцыі, у тым ліку перапёлчыных яек, у Грузію і Кітай, прапрацоўваецца Узбекістан. «Да канца года выйдзем на дзевяць мільёнаў долараў экспартнай прадукцыі, — удакладніла дырэктар прадпрыемства. — Мы вырабляем якасны тавар, які адпавядае тром міжнародным стандартам. А ў найбліжэйшы час атрымаем і знак якасці на перапёлчыны яйкі».

Прадпрыемства не стаіць на месцы, тут рэалізоўваюць інавацыйныя праекты, укараняюць новыя тэхналогіі. «У мінулым годзе прыступілі да рэалізацыі праекта «Будаўніцтва інавацыйнай перапёлкавай фермы замкнёнага цыкла з аўтаматызаваным зборам і пакаваннем таварнага яйка «Крывічы», — дадала Іна Талкачова. — Гэты праект стаў магчымы дзякуючы, у першую чаргу, Мінскаму аблвыканкаму, які вылучыў з інавацыйнага фонду больш за 40 мільёнаў рублёў. Таксама ўклалі ўласныя сродкі, і частка — пазыковыя».

Па словах **старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандра ТУРЧЫНА**, пад такога роду ўнікальныя праекты дзяржава і павінна выдзяляць сродкі: «Вельмі важна рэалізоўваць інвестыцыйныя праекты. Няправільна, калі прадпрыемства будуе нешта толькі з пазыковых сродкаў. На прыкладзе таго ж Кітая: там трэцяя частка маштабных праектаў фінансуецца дзяржавай, прычым незваротна. Яшчэ 30 працэнтаў — уласныя сродкі, і астатняе — пазыковыя. Тады праект мае сэнс». Кіраўнік Міншчыны дадаў, што сёлета аблвыканкам выдзеліў сродкі з інавацыйнага фонду на будаўніцтва завода па перапрацоўцы жывёльнай сыравіны на агракамбінаце «Дзяржынскі».

Яшчэ адна амбіцыйная мэта Салігорскай птушкафабрыкі на перспектыву — вывесці сваю, беларускую пароду перапёлак. «На мой погляд, менавіта генетыка сёння — прыярытэтны кірунак, — звярнула ўвагу Наталля Качанава. — Вы таксама паказалі геаграфію паставак і адзначылі, што адпрацоўваеце Узбекістан. У рамках падрыхтоўкі да Беларуска-ўзбекскага форуму будзем прасоўваць вашу прадукцыю, дадзім вам слова на форуме. Наогул, трэба больш рэкламаваць свае прадукты харчавання».

Пасля пасяджэння кіраўнік цэнтральнага рэгіёна павіншаваў старшыню Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Міхаіла Русага з 70-годдзем, якое сенатар, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі, адзначыў 23 лістапада.

«Ваша работа няпростая, але вельмі патрэбная людзям»

Пасля пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі ўдзельнікі мерапрыемства наведалі новы аб'ект. Парламентарыі ўзялі ўдзел у адкрыцці першай чаргі інавацыйнай перапёлкавай фермы замкнёнага цыкла. Пасля ўвядзення ўсіх аб'ектаў будаўніцтва плануецца атрымліваць штогод не менш за 175 мільёнаў штук перапёлчыных яек. Аб'ём вытворчасці павялічыцца ў 1,5 раза. Рэалізацыя інавацыйнага праекта прынясе станоўчы эфект для Салігорскага раёна — стварэнне не менш як 49 рабочых месцаў з дабаўленай вартасцю звыш 20 тысяч еўра і годным узроўнем заработнай платы — тры тысячы рублёў. Гэты праект з'яўляецца экспартаарыентаваным. Доля экспарту прадукцыі складзе не менш за 60 працэнтаў.

Наталля Качанава, члены Прэзідыума Савета Рэспублікі і Аляксандр Турчын наведалі цэхі будучай фермы, азнаёміліся з відамі прадукцыі, што выпускаецца на Салігорскай птушкафабрыцы, а таксама прадэгуставалі абсалютна новы від прадукцыі — аўтарскія каўбаскі варанавэнджаныя курыныя.

Пасля гэтага ўдзельнікі мерапрыемства наведалі дзеючую пляцоўку Салігорскай птушкафабрыкі. Там парламентарыі азнаёміліся з вытворчай дзейнасцю. Затым Старшыня Савета Рэспублікі і старшыня Мінскага аблвыканкама пагутарылі з работнікамі прадпрыемства.

«Мы рады наведаць прадпрыемства, якім кіруе член Савета Рэспублікі Іна Талкачова. Прыемна было ўбачыць, як паспяхова рэалізоўваецца на птушкафабрыцы даручэнне кіраўніка дзяржавы па рэалізацыі праграмы «Адзін раён — адзін праект», — звярнулася да работнікаў Салігорскай птушкафабрыкі Наталля Качанава. — Вы працуеце на харчовую бяспеку нашай краіны, ваша работа няпростая, але вельмі патрэбная людзям».

Па меркаванні спікера Савета Рэспублікі, для Салігорскага раёна адкрыццё перапёлкавай фермы — гэта знакавая падзея: «І тут усё склалася разам. Тут працуюць спецыялісты, якія хочуць гэтым займацца, хочуць развіваць сваю вытворчасць, паляпшаць умовы працы. І аблвыканкам падтрымаў гэты праект, вылучыўшы сродкі для рэалізацыі. Таму я шчыра вас віншую з адкрыццём яшчэ адной вытворчасці. Тут мы ўбачылі, што кіраўніцтва прадпрыемства жыве не проста сённяшнім, а заўтрашнім днём».

Наталля Качанава адказала таксама на пытанні работнікаў Салігорскай птушкафабрыкі. Супрацоўніца прадпрыемства Таццяна падзякавала Прэзідэнту за мір і спакой у краіне. І спытала: «Якая роля жанчыны ў падтрыманні міру?»

«Жанчына — захавальніца сямейнага ачага. Мы робім усё, каб захоўваць мір у краіне, калі гаворым праўду пра яе. Кажам, што ніколі нікому не пагражалі і не збіраемся. Такім чынам мы супрацьстаім фэйкам. Але самае галоўнае прызначэнне жанчыны — нараджаць дзяцей, — адказала Наталля Качанава. — Жанчына павінна жыць у міры, яна створана для спакою».

Работнік прадпрыемства Андрэй закрануў спартыўную тэму. Ён адзначыў, што ў Салігорску шмат аб'ектаў для заняткаў спортам: «Сёлета ў горадзе адкрылі новую школу, якая не мае аналагаў. Яна абсталявана самымі сучаснымі прыладамі. Плюс дзеці могуць наведваць розныя секцыі. Але праблема ў тым, што яны загружаныя школьнай праграмай. Ці можна тых дзяцей, хто прафесійна займаецца спортам, вызваліць ад заняткаў фізкультурай?» — пацікавіўся мужчына.

«Абмяркуем гэтае пытанне з міністрамі спорту і адукацыі», — паабяцала Наталля Качанава і заўважыла, што такая колькасць спартыўных аб'ектаў, якая ёсць у краіне, — гэта сапраўды фантастыка. Важна таксама, каб моладзь займалася спортам, але трэба разумець: заняткі прафесійным спортам — гэта адно, а проста спортам — зусім іншая справа».

Узнімалася і пытанне па рабоце таксі: салігарчане звярнулі ўвагу на высокі кошт за паслугі перавозчыкаў. «Урад убачыў, што ёсць праблемы ў рабоце службы таксі. Перавозчыкі не маглі гарантаваць бяспеку, рынак стаў дзесьці шэрым: у выніку, выраслa колькасць ДТЗ. Было прынята рашэнне структураваць гэтую сістэму. Мінаблвыканкам і райвыканкамы ствараюць рэестр тых, хто будзе працаваць на дадзеным рынку. Чым хутчэй пройдуць гэтыя працэсы, тым хутчэй цэны нармалізуюцца», — запэўніла Старшыня Савета Рэспублікі.

Супрацоўніца прадпрыемства Алена пачала сваё пытанне з падзякі ў адрас Аляксандра Турчына за садзейнічанне ў рэканструкцыі дарогі М23 ад Мінска да Салігорска. «Дабірацца цяпер стала вельмі камфортна! Але ці мяркуецца рэалізацыя праекта ў частцы рэканструкцыі ўчастка ад 2-га рудаўпраўлення да Старобіна?» — пацікавілася жанчына.

Аляксандр Турчын адказаў, што праект на рэканструкцыю ёсць, але мае на ўвазе фінансавую дапамогу «Беларуськалія». «І ва ўрадзе, і з віцэ-прэм'ерам мы абмяркоўвалі гэта пытанне: калі ёсць праектна-кашторысная дакументацыя, то дарогу зрабіць трэба», — сказаў губернатар.

Кіраўнік вобласці адзначыў, што цяпер дабудоўваецца дарога да Жодзіна, на наступны год — ад Жодзіна да Барысава, і яшчэ адзін перспектыўны напрамак — якраз дарога ад Салігорска да Старобіна. «Не магу паабяцаць, што гэта будзе адназначна на наступны год, але ў планах зрабіць яе ў найбліжэйшыя некалькі гадоў ёсць», — падагульніў Аляксандр Турчын.

«І я абавязкова падтрымаю гэтае рашэнне! Тое, як развіваецца сёння Мінская вобласць, — выдатна! — падкрэсліла Наталля Качанава. — Не так даўно мы наведвалі Дзяржынскі ТЦСАН: не многія раёны могуць такім пахваліцца. У Мінскай вобласці ў многіх сферах бліскучыя вынікі, і ў сельскай гаспадарцы вы найлепшыя, як адзначыў на свяце «Дажынкі» ў Валожыне Аляксандр Рыгоравіч».

Аляксандр Турчын дадаў, што ў найбліжэйшы час новы ТЦСАН з'явіцца і ў Салігорску. Яго адкрыюць на базе будынка вайсковай часці.

Пасля шчырай размовы з супрацоўнікамі прадпрыемства Старшыня Савета Рэспублікі заклікала ўсіх заўсёды даносіць праўду аб Беларусі: «Тое, што мы сёння жывём у мірнай краіне, — гэта, перш за ўсё, заслуга нашага Прэзідэнта. Гэта найцяжэйшая работа — у турбулентным свеце захоўваць мір і спакой. За 30 гадоў мы стварылі такую краіну, якой можна ганарыцца».

Па яе словах, задача кожнага з нас — зрабіць так, каб гэтыя мір і спакой у сваёй краіне захаваць. «Нам усім трэба ўсюды казаць пра тое, якая ў нас Беларусь. Таму што, на жаль, сёння фэйкі і хлусня апанавалі ўсю інфармацыйную прастору. Таму наша задача — адказна працаваць і казаць праўду пра сваю краіну», — падагульніла Старшыня Савета Рэспублікі.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота БелТА.

БЮДЖЭТ, НОВЫЯ ВУЛІЦЫ І ВЕЛАСІПЕДНЫ РУХ

Якія пытанні абмеркавалі дэпутаты ў Мінгарсавеце

На мінулым тыдні ў беларускай сталіцы адбылася сёмая пазачарговая сесія Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў. Народныя выбраннікі закранулі шырокі спектр пытанняў і змяненняў, сярод якіх — бюджэт беларускай сталіцы, інвестыцыйная праграма горада на 2024 год, зацвярджэнне Канцэпцыі развіцця веласіпеднага руху і многае іншае. Карэспандэнт «Звязды» пабываў на адказным пасяджэнні і высветліў усе падрабязнасці.

КОТГСы — добрыя памочнікі

Падчас пазачарговай сесіі Мінгарсавета ўзнагародзілі пераможцаў агляду-конкурсу на найлепшую арганізацыю работы калегіяльных органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (КОТГС). «Мэта ўсіх падобных конкурсаў — прыцягнуць насельніцтва да ўдзелу ў добраўпарадкаванні мясцовасці, дзе людзі непасрэдна пражываюць, — адзначыў **старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Арцём ЦУРАН.** — А камітэты грамадскага самакіравання і тэрытарыяльныя акруговыя саветы — нашы памочнікі, якія дапамагаюць аб'ядноўваць жыхароў. Падчас аб'езду КОТГС гэтай восенню мы ўбачылі розныя падыходы да добраўпарадкавання. Калі побач зялёная зона ці вялікі масіў — выкарыстоўваюць мясцовыя матэрыялы. Калі гэта гатовая забудова, то работа накіравана ў асноўным на абнаўленне дваровай пляцоўкі новымі малымі архітэктурнымі формамі».

Па словах старшыні Мінгарсавета, дзейнасць КОТГС і тэрытарыяльных акруговых саветаў уключае не толькі добраўпарадкаванне, але і выхаваўчую работу, прыцягненне моладзі да грамадскай дзейнасці: «Мы паглядзелі некалькі цікавых лакацый у розных раёнах горада, у стварэнні якіх удзельнічала моладзь. Маладыя людзі працуюць на карысць сваіх двароў, для сваіх дзяцей і суседзяў. Такія ініцыятывы неабходна акумуляваць і распаўсюджваць на ўвесь горад».

Па выніках конкурсу пераможцамі сталі прадстаўнікі КОТГС Савецкага раёна. Ганаровае другое месца падзялілі КОТГС Заводскага і Маскоўскага раёнаў. Трэцяе месца было прысуджана камітэтам тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання трох раёнаў горада: Цэнтральнага, Кастрычніцкага і Першамайскага.

Бюджэт і інвестпраграма сталіцы

У ліку рашэнняў, прынятых у ходзе сесіі, — змяненні ў сталічным бюджэце. «Зыходзячы з дынамікі паступленняў па падатку на прыбытак, прапануецца павялічыць агульны аб'ём даходаў бюджэту горада Мінска на 2024 год на 170 мільёнаў рублёў», — адзначыў **начальнік галоўнага фінансавага ўпраўлення Мінскага гарвыканкама Уладзімір ЖУКОВІЧ.**

Па галіне «Транспарт» сродкі выдзеляць на субсідыі прадпрыемствам транспарту. Па галіне «Жыллёва-камунальная гаспадарка» дадатковае фінансаванне прадугледжана на ўтрыманне вулічна-дарожнай сеткі Мінска, а таксама на капітальны рамонт жыллёвага фонду, капітальны рамонт вулічна-дарожнай сеткі, утрыманне зялёных зон; бягучы рамонт жыллёвага фонду, утрыманне аб'ектаў асвятлення, мастацка-дэкаратыўнае афармленне сталіцы, бягучы рамонт прыдамавых тэрыторый.

Па галіне «Ахова здароўя» дадатковыя асігнаванні выдзеляць на набыццё медыцынскай тэхнікі і на набыццё медыкаментаў і лекавых сродкаў. Па галіне «Культура» — на арганізацыю і правядзенне культурных мерапрыемстваў, а таксама на бягучыя выдаткі УП «Кінавідэапракат», звязаныя з культурнай дзейнасцю. Па галіне «Адукацыя» сродкі накіруюць на бягучы рамонт установаў адукацыі, а таксама на іх бягучае функцыянаванне (правядзенне мерапрыемстваў з дзецьмі і набыццё навагодніх падарункаў).

Па галіне «Сацыяльная палітыка» выдзеленыя асігнаванні будуць выкарыстаны на набыццё абсталявання ўстановам сацабароны, бягучы рамонт будынкаў і абсталяванне атрыбутамі безбар'ернага асяроддзя. Дадатковыя сродкі таксама будуць накіраваны на выкананне бягучага рамонту сацыяльных кватэр дзяржаўнага жыллёвага фонду. Акрамя гэтага, прынятае рашэнне прадугледжвае перараз мяркаванне асігнаванняў у рамках агульнага аб'ёму інвестпраграмы і скарачэнне планавага аб'ёму дэфіцыту бюджэту Мінска на 76,5 мільёна рублёў.

Таксама былі ўнесены змяненні ў інвестпраграму сталіцы. **Старшыня камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінскага гарвыканкама Ірына ГОНТАРАВА** адзначыла, што за кошт перараз мяркавання бюджэтных сродкаў у рамках праграмы бюджэтныя асігнаванні будуць накіраваны на аплату будаўнічых работ па аб'екце «Перавод Мінска на водазабеспячэнне з падземных крыніц», а таксама для аплаты работ па будаўніцтве сярэдняй школы ў шматфункцыянальным комплексе «Мінск Свет», дзіцячых садкоў у жылым раёне Усходні і ў квартале вуліц Ваўпшасава — Таёжнай.

Якім будзе веласіпедны рух?

На пазачарговай сесіі Мінгарсавета дэпутаты зацвердзілі і Канцэпцыю развіцця веласіпеднага руху. Па словах **начальніка галоўнага ўпраўлення спорту і турызму Мінскага гарвыканкама Максіма ВАРАПАЯ**, неабходнасць прыняцця новага рашэння абумоўлена развіццём веларуху, а таксама актуалізацыяй даных і планаў па яго далейшым развіцці: «Рэалізацыя Канцэпцыі будзе садзейнічаць забеспячэнню адкрытасці, бяспекі і экалагічнай устойлівасці горада, інтэнсіўнаму развіццю веласіпеднай інфраструктуры, прызначанай для павышэння фізічнай актыўнасці насельніцтва, пашырыць магчымасць бесперашкодных рухаў насельніцтва з выкарыстаннем веласіпедаў», — запэўніў спецыяліст.

Максім Варапай дадаў, што веласіпед у сталіцы ў асноўным выкарыстоўваецца як сродак для адпачынку і фізічнай культуры, пры гэтым сезонна. Да 2024 года працягласць веладарожак сталіцы склала больш за 293 кіламетры, з іх магістральнай веладарожкі — 27 кіламетраў, веладарожкі на праезнай частцы — 2,1 кіламетра, адасобленых і сумешчаных (адаптаваных) дарожак — больш за 264 кіламетры. Для веласіпедыстаў у Мінску ўстаноўлена 5852 святлафоры, створана 1650 велапарковак, пяць навесаў, 82 велагаражы і 72 велабоксы. У кожным раёне сталіцы распрацаваны велапешаходныя турыстычныя маршруты агульнай працягласцю каля 70 кіламетраў.

«Асноўнымі ж праблемамі развіцця веласіпеднага руху застаюцца адсутнасць неабходнай працягласці веласіпедных шляхоў і іх злучэння ў адзіную сетку, а таксама неадпаведнасць патрабаванням якасці дарожнага пакрыцця і бардзюраў праезнай часткі, недахоп тэхнічных сродкаў арганізацыі веласіпеднага руху», — падкрэсліў Максім Варапай.

Па яго словах, да 2030 года ў Мінску павінна быць створана да 380 кіламетраў асноўных веласіпедных шляхоў у выглядзе адасобленых веладарожак і адаптаваных для веларуху тратуараў. Таксама палітыка па развіцці веласіпеднага руху ў Мінску прадугледжвае і такія меры, як стварэнне больш удасканаленых канструкцый веласіпедаў, арганізацыю ва ўстановах адукацыі сістэмы навучання непаўналетніх бяспечным паводзінам пры руху на веласіпедзе па агульнадаступнай сетцы вуліц і аўтамабільных дарог, арганізацыю дадатковай падрыхтоўкі веласіпедыстаў, якія дасягнулі паўналетняга ўзросту, забеспячэнне бесперапыннага безбар'ернага асяроддзя (адсутнасць перашкод для руху і забеспячэнне належнай якасці дарожнага пакрыцця па маршрутах веласіпеднага руху).

«Правядзенне такіх мерапрыемстваў, як «Дзень без аўтамабіля», «Першы ровар», «У школу на веласіпедзе», спрыяе замацаванню ў грамадзян станоўчага стэрэатыпу аб выкарыстанні ў дарожным руху веласіпедаў, а ў веласіпедыстаў — мадэлі бяспечных паводзін на дарогах», — падсумаваў Максім Варапай.

Назвы новым вуліцам

На пазачарговай сесіі Мінгарсавета было прынята рашэнне прысвоіць назвы новым вуліцам сталіцы. «Мэта рашэння — найменне частак горада для рэгістрацыі асобных аб'ектаў і афармлення ўсіх прадугледжаных заканадаўствам дакументаў з адраснай прывязкай, — адзначыла **начальнік упраўлення культуры Мінскага гарвыканкама Кацярына ЛУЧЫНА.** — Прапановы аб прысваенні найменняў у верасні былі апублікаваны ў сталічных газетах. Заўвагі і іншыя прапановы ад жыхароў сталіцы не паступалі».

Праектаваная вуліца № 6 на тэрыторыі жылога раёна Лошыца будзе насіць імя падпольшчыцы часоў Вялікай Айчыннай вайны Надзеі Маісеевай (вуліца Надзеі Маісеевай), а праектаваная вуліца № 12 у гэтым жа раёне будзе называцца завулкам Любанскіх — у гонар заснавальнікаў Лошыцкага сядзібна-паркавага комплексу.

Даніil ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.

ПРАЦАВАЦЬ РАЗАМ

Пагадненне аб супрацоўніцтве падпісалі кіраўнікі гарсаветаў Брэста і Гродна

У Брэсцкім гарвыканкаме адбылася цырымонія падпісання пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Гродзенскім і Брэсцкім гарадскімі Саветамі дэпутатаў. Дакумент падпісалі старшыня Гродзенскага гарадскога Савета Алег Бялінскі і старшыня Брэсцкага гарадскога Савета Андрэй Філановіч.

Пагадненне накіравана на паглыбленне, умацаванне і пашырэнне сувязяў паміж двума прадстаўнічымі органамі. Бакі падкрэслілі ўзаемную зацікаўленасць у развіцці адкрытага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

Змест пагаднення ўлічвае таксама традыцыі дружбы і даверу, якія склаліся паміж жыхарамі гарадоў Гродна і Брэста. Чакаецца, што названае супрацоўніцтва будзе падставай для новых ініцыятыў і праектаў дэпутацкіх корпусаў абодвух гарадоў, падкрэслілі ў Брэсцкім гарадскім Савеце.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Брэсцкага гарвыканкама.

ЗАХАВАЦЬ ТРАДЫЦЫЙНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

Гродна прымаў семінар Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі

Трэба сказаць, што гэты семінар праходзіць рэгулярна і з'яўляецца свайго роду дзейным органам пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі, які скіраваны на будаўніцтва Саюзнай дзяржавы. Пасяджэнні праходзяць па чарзе ў кожнай краіне. Чарговы семінар нядаўна адбыўся ў Гродне і прысвечаны тэме культуры. У ім узялі ўдзел як дэпутаты, так і прадстаўнікі ўстаноў культуры, духавенства, кінаіндустрыі, навуковых і адукацыйных колаў.

Як зазначыў **старшыня Камісіі Парламенцкага сходу па культуры, навуцы і адукацыі, першы намеснік Камітэта Дзяржаўнай Думы Расіі па развіцці грамадзянскай супольнасці, пытаннях грамадскіх і рэлігійных аб'яднанняў Мікалай БУРЛЯЕЎ**, падобныя мерапрыемствы дапамагаюць замацаваць сувязі паміж дзвюма народамі і ствараюць умовы для далейшага супрацоўніцтва. На яго думку, культура — аснова нацыянальнай бяспекі, бо ў эпоху перагляду традыцыйных каштоўнасцяў адыгрывае ключавую ролю ў захаванні сваіх каранёў, сапраўднай гісторыі сваіх народаў. І ў гэтым сэнсе краінам варта трымацца разам.

Мікалай Бурляеў звярнуў увагу на новую тэму — сацыяльную інжынерыю, якой карыстаюцца заходнія апаненты, каб маніпуляваць свядомасцю і фарміраваць грамадскую думку пад тыя ці іншыя палітычныя працэсы. З дапамогай медыя, адукацыйных праграм, культурных ініцыятыў ствараецца новае асяроддзе, якое адыходзіць ад мясцовых рэалій і каштоўнасцяў, тым самым выклікаючы раскол і напружанасць у грамадстве. Для Саюзнай дзяржавы важна супрацьстаяць гэтаму націску і не ўпусціць моладзь, якая выросла ў новых рэаліях.

Трэба сказаць, што ў плане інтэграцыі створана нямала сумесных праектаў, якія сталі брэндам Саюзнай дзяржавы. Адзін з іх — міжнародны фестываль «Славянскі базар у Віцебску». Яго дырэктар, **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Глеб ЛАПІЦКІ** ўспрымае такія сустрэчы, як пляцоўку для новых ідэй.

— У фестывалі мастацтваў «Славянскі базар» Саюзная дзяржава ўдзельнічае больш за 20 гадоў. У рамках форуму праходзяць дні Саюзнай дзяржавы. Чым больш мы станем рэалізоўваць практычных мерапрыемстваў, тым лепш нашы грамадзяне будуць успрымаць сэнс Саюзнай дзяржавы і тыя плюсы, якія яна дае двум народам, двум незалежным краінам. Гэта важна данесці да моладзі, — лічыць Глеб Лапіцкі.

У рамках 80-годдзя Вялікай Перамогі, што будзе святкавацца ў наступным годзе, парламентарыі абедзвюх краін прыкладуць намаганні ў захаванні гістарычнай памяці, выхаванні патрыятызму і згуртаванасці народаў, якія здабывалі перамогу над нацызмам у гады Вялікай Айчыннай вайны. Прагучала прапанова аб выданні беларуска-расійскага часопіса, у якім дакладна і праўдзіва будзе расказвацца аб важных момантах, звязаных з гістарычным мінулым. Бо менавіта разуменне агульных культурных кодаў дазволіць зрабіць саюз моцным і ўстойлівым.

Па словах удзельнікаў, на семінары падымаліся сур'ёзныя пытанні, якія скіраваны на развіццё моцнага грамадства: патрыятызм, гонар за краіну. У сучасных умовах важна захаваць прыхільнасць да сваёй краіны, яе культуры і традыцый. Гэта асабліва актуальна для моладзі, якая, магчыма, ніколі не сутыкнецца з тымі цяжкасцямі, якія перажылі іх продкі, але павінна ганіць і паважаць іх подзвігі. Спікеры сышліся ў меркаванні, што паспяховае выхаванне моладзі заснавана на трох прынцыпах: веданні гісторыі, павазе да роднай культуры і актыўным удзеле ў жыцці краіны. Імкненне захаваць гістарычную памяць і культуру будзе садзейнічаць стварэнню больш здаровага і згуртаванага грамадства, упэўнены ўдзельнікі семінара.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота з адкрытых крыніц.

Старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА адзначыла:

— Гэты семінар — свайго роду зверка пазіцый дзвюх краін у такім важным аспекце, як культура. І заканадаўства, і дзяржаўная палітыка абедзвюх краін павінны ісці ў адным кірунку. Быў прадэманстраваны працяг напрацаваных праектаў і зроблены акцэнт на новых ідэях. Так, упершыню была звернута ўвага на захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, у прыватнасці на перспектывы сумесных даследаванняў падрыхтоўкі дасье на аб'екты Гродзенскай вобласці, якія ўключаны ў папярэдні спіс ЮНЭСКА.

Такая ўстаноўка асабліва важная для Гродна і рэгіёна, таму што менавіта тут знаходзіцца самая вялікая колькасць гісторыка-культурных каштоўнасцяў краіны. Гродна ў гэтым сэнсе сапраўдная жамчужына Беларусі, дзе не проста захоўваецца спадчына, а яна адраджаецца, аднаўляецца. Нашы госці былі ўражаны такімі аб'ектамі, як Каложская царква, Стары замак, гістарычная забудова горада. Высокую ацэнку атрымала тэатральная пастаноўка Тэатра лялек, з будынка якога пачалося развіццё тэатральнага мастацтва Гродна. Гродзенцы яшчэ раз прадэманстравалі вялікую работу дзяржавы, мясцовых органаў кіравання і самакіравання ў развіцці культурнай спадчыны.

Для актыўнага адпачынку

У адным са сквераў Брэста ўрачыста адкрылі спартыўную пляцоўку

Гэтая зона актыўнага адпачынку для падтрымання здаровага ладу жыцця з'явілася дзякуючы рэалізацыі адной з грамадзянскіх ініцыятыў, што перамагла ў абласным конкурсе. Спартыўны вулічны інвентар, які ўстанавілі на пляцоўцы, прадугледжвае магчымасці для заняткаў на свежым паветры людзей ад 7 гадоў да 70+. Пляцоўка стала чаканай падзеяй для многіх і многіх жыхароў гэтага раёна.

Як расказаў карэспандэнту газеты **старшыня Брэсцкага гарадскога Савета Андрэй ФІЛАНОВІЧ**, з ініцыятывай выступілі жыхары найбліжэйшых дамоў па вуліцы Маскоўскай:

— Нарадзілася калектыўная ідэя ўстанавіць у скверы вулічныя трэнажоры для трэніровак, а дакладней, для падтрымання фізічнай формы людзей усіх узростаў. Ініцыятарам, ідэйным натхняльнікам, а пазней адным з арганізатараў выступіла дэпутат гарадскога Савета Наталля Арцыменя. Гарадскі Савет дапамог афарміць ідэю і падаць матэрыялы на конкурс, арганізаваны абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў. У рамках конкурсу праект «Здаровы горад — горад Брэст» на суму звыш 22 тысяч рублёў аказаўся ў ліку пераможцаў.

Аўтары ініцыятывы адразу ж пачалі з пошукаў нераўнадушных, зацікаўленых людзей з ліку жыльцоў навакольных дамоў, — працягваў Андрэй Філановіч. — Апошнія выказалі гатоўнасць фінансава паўдзельнічаць у добрай справе. Паводле ўмоў конкурсу, частку

фінансавання павінны ўзяць на сябе грамадзяне, яшчэ частку — спонсары, астатняе выдзяляецца з бюджэту. Так і сталася ў нашым выпадку. Жыхары сабралі 10 працэнтаў кошту праекта. Спонсарскую дапамогу аказала машынабудаўнічае прадпрыемства «КОМПА». Больш чым 18 тысяч было выдзелена з абласнога бюджэту. Рашэннем гарвыканкама выканаўцам работ назначылі прадпрыемства КУП «ЖРЭУ г. Брэста». Усе сродкі сабралі на адным рахунку, і названае прадпрыемства ўзялося за работу. Такім чынам, добрую справу ажыццявілі агульнымі намаганнямі, і спадзяемся, што паспяховы праект стане добрым прыкладам для іншых.

Старшыня гарсавета падкрэсліў таксама, што гэта быў першы вопыт падобнай работы і запэўніў, што ў гарадскім Савеце яго будуць абагульняць, расказваць насельніцтву аб тым, як пры мінімальным удзеле кожнага талакой можна зрабіць карысную справу для ўсіх. А ў тым, што вулічныя трэнажоры патрэбныя гараджанам, ужо ўпэўніліся тыя, хто іх апрабаваў. Там ёсць прыстасаванні, якія разлічаны на пенсіянераў. На гэтым ад пачатку рабіўся асаблівы акцэнт. Людзям сярэбранага ўзросту, якія маюць шмат вольнага часу, важна займацца фізічнымі практыкаваннямі. Яшчэ больш важна, каб школьнікі пакідалі свае гаджэты дома, прыходзілі сюды і бавілі час з карысцю для здароўя на свежым паветры, гаварылі падчас адкрыцця.

На ўрачыстае адкрыццё пляцоўкі, акрамя старшыні гарадскога Савета, прыйшлі кіраўнік адміністрацыі Маскоўскага раёна Брэста Аляксандр Прадун, начальнік КУП «ЖРЭУ г. Брэста» Ігар Гадун, дырэктар Брэсцкай абласной дырэкцыі ААТ «Белгазпрамбанк» Наталля Арцыменя, заснавальнік машынабудаўнічага прадпрыемства «КОМПА» Эла Джангозава, старшыня праўлення ЖБПК № 5 Галіна Валынчук, жыхары мікрараёна.

Пасля пераразання сімвалічнай стужкі ахвотныя, у тым ліку госці, змаглі на практыцы ацаніць трэнажоры. І першыя ўражанні атрымаліся надзвычай пазітыўнымі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Брэсцкага гарвыканкама.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by **(для зваротаў):** zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 10.785. **Нумар падпісаны ў 19.30 26 лістапада 2024 года.**

Эміль НАСІРЛІ:

«ДУХ ПАРТНЁРСТВА — АСНОВА МІРАЛЮБІВЫХ АДНОСІН...»

Эміль НАСІРЛІ — галоўны рэдактар міжнароднага часопіса «Мой Азербайджан», што выходзіць у Баку; публіцыст, якога ведаюць у многіх краінах свету, асабліва — на постсавецкай прасторы. Аўтар цэлага шэрагу кніг, прысвечаных праблемам знешнепалітычнага характару. Мы задалі вядомаму журналісту, медыяэксперту некалькі пытанняў.

— Вы часта бываеце ў Беларусі, добра ведаеце нашу краіну. Як бы Вы ахарактарызавалі сённяшні стан беларуска-азербайджанскіх адносін?

— Узаемная павага і давер з'яўляюцца адметнымі рысамі беларуска-азербайджанскага дыялогу. Нашы адносіны ўжо правераны часам. Яны маюць вельмі добрую гісторыю. На працягу ўсяго перыяду ўзаемадзеяння мы заўсёды вырашалі пытанні, звязаныя з развіццём нашых адносін. Паміж намі ніколі не было ніякіх нявырашаных пытанняў, якія патрабавалі б нейкага аператыўнага ўмяшальніцтва. Духам партнёрства прасякнута ўся сістэма ўзаемаадносін паміж нашымі краінамі. І нас звязвае не толькі агульная гістарычная памяць. Гасціннасць, прыязнасць, талерантнасць — гэта нацыянальныя рысы, якія збліжаюць беларусаў і азербайджанцаў. Паколькі нашы народы былі ў добрым сяброўстве, калі знаходзіліся ў адной дзяржаве. Мы з добрай памяццю ўзгадваем адносіны да Беларусі Гейдара Аліевіча Аліева, а беларускі народ на чале з вашым Прэзідэнтам Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам заўсёды падкрэслівалі мудрасць і прыязнасць вялікага Гейдара Аліева. Прыемна, што на фундаменце, закладзеным Гейдарам Аліевічам у аснову нашых міждзяржаўных адносін, сучасныя прэзідэнты Ільхам Аліеў і Аляксандр Лукашэнка выбудавалі паміж сабою сапраўды сяброўскія і братэрскія адносіны, пазітыўная энергетыка якіх перадаецца на ўсе сферы нашага супрацоўніцтва. Візіты лідара Беларусі ў Азербайджан і кіраўніка Азербайджана ў Беларусь валодаюць вялікім значэннем для далейшага развіцця сяброўскіх сувязяў паміж двума дзяржавамі, якія супрацоўнічаюць і падтрымліваюць адна адну. Хацелася б адзначыць, што ў межах дзяржаўнага візіта ў Азербайджан прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сумесна з азербайджанскім калегам Ільхамам Аліевым наведаў узнаўляльныя тэрыторыі ў Карабахскім рэгіёне і адзначыў, што адным з галоўных праектаў Беларусі стане стварэнне ў Карабаху комплекснага сучаснага аграгарадка, які будзе ўключаць вытворчасць і перапрацоўку сельскагаспадарчай прадукцыі. Таксама прадугледжваецца будаўніцтва ў Агдамскім раёне населенага пункта, разлічанага на 420 сем'яў.

— Нядаўна Вас прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. А ўвогуле, у той час, калі літаратура ўжо даўно не медыя, калі раманы не клічуць на барыкады, ці здольнае мастацкае слова зрабіць свет болей справядлівым, болей добрым?

— Нядаўна я даведаўся, што мяне прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Карыстаючыся нагодай, хачу падзякаваць складу прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі, асабіста старшыні СПБ Алесю Карлюкевічу, усім беларускім калегам за выказаны мне гонар быць членам Саюза. Мяне, як члена пісьменніцкіх арганізацый Азербайджана, Казахстана, Кыргызстана, Узбекістана і Таджыкістана, заўсёды захапляў Саюз пісьменнікаў Беларусі, цягнула да пісьменнікаў, таму што гэта мудрацы, гэта вельмі назіральныя, каларытныя людзі. У шэрагах грамадскага аб'яднання сёння вельмі шмат вядомых паэтаў, празаікаў, публіцыстаў і краязнаўцаў. У іх творах знаходзіць адлюстраванне як гераічнае мінулае народа, так і падзеі сучаснасці, узнімаюцца пытанні дабра і зла, захавання традыцый, сцвярджэння міру і парадку на Зямлі. У Азербайджане штогод на палiцах крам з'яўляюцца новыя творы беларускіх пісьменнікаў. І гэта далёка не ўсе дасягненні. Я думаю, што чалавецтва за сотні гадоў існавання на зямлі змяніла свет да лепшага болей, чым якая іншая жывая істота. Змена цывілізацый, навуковыя і тэхнічныя рэвалюцыі, унікальныя творы мастацтва — усё гэта вынік чалавечай працы, цяжкай фізічнай ці натхняльнай, інтэлектуальнай. Тысячагоддзі нашага існавання на зямлі захавалі мноства імёнаў вялікіх геніяў. Але мне здаецца, што на ўзроўні з адоранасцю не меней важныя і духоўныя якасці: яны, людзі, мянялі і свет да лепшага, стваралі нешта вялікае і патрэбнае, і ў сэрцах гэтых людзей жыла любоў да ўсяго чалавецтва, жылі дабрыня, сумленне і жаданне прыўнесці ў свет нешта карыснае. Доказы справядлівасці гэтай думкі якраз можна знайсці ў многіх творах азербайджанскай і беларускай мастацкай літаратуры. Я ўпэўнены, што літаратура здольная рабіць свет болей справядлівым, болей добрым, таму што жыццё на зямлі становіцца лепей, калі вакол нас з'яўляецца ўсё больш людзей, надзеленых высакароднасцю; людзей, якія імкнуцца дапамагчы ўсім навокал. Не кожны чалавек з вялікім сэрцам застаецца ў гісторыі, але менавіта на мноства нераўнадушных, здольных адгукнуцца на чужую бяду, чужыя клопаты, і трымаецца наш свет.

Эміль Насірлі на прэзентацыі сваёй кнігі пра Гейдара Аліева ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

— Калі б Вас папрасілі прадставіць Азербайджан і азербайджанцаў праз мастацкі твор, што б Вы параілі прачытаць беларусам?

— Я параіў бы беларускім чытачам нязменную крыніцу для вывучэння гісторыі і культуры азербайджанскага народа — «Кітабі Дэдэ Гаргуд». Дастан пра Дэдэ Гаргуда з'яўляецца народным помнікам мастацтва, у якім адлюстраваны патрыятызм, гераізм, мудрасць, дальназоркасць, духоўныя рысы цюркаў-агузаў. «Кітабі Дэдэ Гаргуд» — адзіны помнік кніжнага эпасу цюркаў-агузаў, які захаваўся праз стагоддзі. Сказ пра Дэдэ Гаргуда адлюстраваў і касмалагічныя ўяўленні агузаў, і гістарычныя падзеі, якія адбываліся ў далёкія часы. У эпасе, які з'яўляецца ўнікальным помнікам цюркскага свету, згадваюцца шматлікія азербайджанскія тапонімы, выяўляюцца пачуцці чыстага кахання, павагі да старэйшых, любові да Радзімы. Паводле адпаведнага Распараджэння вялікага лідара Азербайджана Гейдара Аліева, 1300-годдзе эпасу «Кітабі Дэдэ Гаргуд» шырока адзначалася ў Азербайджане. Гейдар Аліеў сказаў тады, што кожны азербайджанец па праве можа ганарыцца гэтым эпасам.

— Толькі што, дзякуючы намаганням доктара філалагічных навук Флоры Наджы, у Баку на азербайджанскай мове выдадзена кніга твораў беларускага класіка Уладзіміра Караткевіча. Як вы лічыце, тэма мастацкага перакладу, тэма літаратурнай дыпламатыі можа быць часткай дыпламатычных адносін паміж рознымі краінамі?

— Азербайджан настолькі літаратурацэнтрычная краіна, што мы здолелі арганізаваць на сур'ёзным узроўні кнігавыданне, якое можа прэзентаваць свету як па колькасці выдадзеных кніг, так і па якасці мастацкага прадукту нашы краінавыя, нацыянальныя прыярытэты ў розных жанрах. Я маю на ўвазе перш за ўсё значэнне перакладу літаратурных твораў на іншыя мовы народаў свету. Трэба імкнуцца рабіць так, каб кнігі маглі трапляць з адной прасторы ў іншыя моўныя абсягі, каб іх змаглі прачытаць прадстаўнікі розных народаў. Так, можна вылучыць і перакладзены на азербайджанскую мову зборнік празаічных і паэтычных твораў Уладзіміра Караткевіча і падзякаваць Флоры Наджы, што яна разам з калегамі здолела пракласці яшчэ адзін масток нашай беларуска-азербайджанскай літаратурнай дружбы.

У нашай рэспубліцы часта праходзяць прэзентацыі кніг пісьменнікаў з розных іншых краін свету, тых кніг, якія перакладзены на азербайджанскую мову. І таксама — прэзентацыі кніг нашых пісьменнікаў, якія выдадзены на розных мовах свету. І ў іншых сусветна вядомых гарадах, краінах мы прэзентуем нашы здабыткі. Напрыклад, мая кніга «Гейдар Аліеў. 100 імгненняў жыцця» была прадстаўлена ў 11 краінах свету. Прайшла прэзентацыя і ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў Мінску. Менавіта такія прэзентацыі даюць магчымасць пазнаваць, адкрываць Азербайджан чытачам іншых краін на сваёй роднай мове. І такая праца з'яўляецца яркім і дзейсным прыкладам літаратурнай, духоўнай дыпламатыі. Мяркую, што, каб дамагчыся поспеху, каб загаварыць з усім светам, трэба быць надзвычай уважлівым да мастацкага перакладу.

— Калі б Вы прысвяцілі адзін з нумароў міжнароднага часопіса «Мой Азербайджан» Беларусі, якія тэмы і якіх герояў Вы раскрылі б на старонках выдання?

— Думаю, што калі мы прысвяцім адзін з нумароў часопіса «Мой Азербайджан» Беларусі, асноўныя тэматычныя кірункі супадуць з тымі дзяржаўнымі праграмамі вашай краіны, мэтай якіх з'яўляецца паступальнае павышэнне ўзроўню і якасці жыцця грамадзян, развіццё гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі, былі б у такім адмысловым выпуску і старонкі пра навуку, культуру, турыстычныя здабыткі Беларусі, пра талерантнасць беларусаў... Паказалі б старонкі памяці пра вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Адлюстравалі б тэму Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, расказалі б пра подзвігі герояў Беларусі і азербайджанцаў, якія ваявалі ў Беларусі. Дарэчы, мы неаднойчы звярталіся да франтавога лёсу двойчы Героя Савецкага Саюза Азі Асланава, які ў Вялікую Айчынную вайну вызваляў Вілейку, Барысаў, Смаргонь, Мінск. Баявы шлях 35-й гвардзейскай танкавай брыгады, на чале якой быў камандзір Асланаў, мог бы стаць і не віртуальным, а сапраўдным маршрутам знаёмства нашай моладзі з Беларуссю.

— Сёння, верагодна, як ніколі востра стаіць пытанне пра аўтарытэт лідараў у будаўніцтве кожнай дзяржавы асобна і ўсяго свету разам. Што Вы думаеце з гэтай нагоды? Якія асобы ўяўляюцца Вам з гэтага пункту гледжання найболей дзейснымі?

— Большасць людзей верыць, што сутнасць лідарства — гэта сіла, адпаведным чынам яны і разважаюць, што быццам тыя, хто валодае ведамі і інтэлектам, і ёсць лідары. Я думаю, што аўтарытэт улады тады расце, калі грамадзяне гэтай краіны падтрымліваюць ідэалы, каштоўнасці і прынцыпы лідара, кіраўніка дзяржавы. Трэба ў гэтым плане пачуць мудрага лідара Сінгапура Лі Куана Ю: «Я не моцны ў філасофскіх развагах. Мне ўсё гэта вельмі цікава, але ва ўласным жыцці я кіруюся зусім не тэорыямі. Я раблю справу, і няхай пасля іншыя вышукваюць, якія прынцыпы былі пакладзены ў аснову маіх удалых рашэнняў». Прызнак лаяльнасці грамадзян да працы органаў улады, прызнанне яе паўнамоцтваў у многім залежыць ад аўтарытэта лідара дзяржавы. Гэта значыць, без аўтарытэта лідара нацыі няма аўтарытэта дзяржавы.

У сённяшнім свеце ёсць нямала палітыкаў, дзейнасць якіх можна лічыць правальнай. Таму свет цяпер знаходзіцца на мяжы трэцяй сусветнай вайны. Але ёсць і лідары, якія карыстаюцца павагай і падтрымкай перш-наперш свайго народа, змагаюцца за захаванне міра і дабрабыту. Такімі лідарамі з'яўляюцца прэзідэнты нашых краін. Дзякуючы цёплым адносінам двух прэзідэнтаў двухбаковыя стасункі Азербайджана і Беларусі знаходзяцца на пад'ёме ва ўсіх галінах.

Хачу нагадаць, што я некалькі разоў быў удзельнікам «Вялікай размовы з Прэзідэнтам» у Мінску і там быў сведкам адкрытасці, паважлівага дыялогу Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ў стасунках з журналістамі, прадстаўнікамі СМІ і рознымі асобамі. Аляксандр Лукашэнка быў з афіцыйнымі і рабочымі візітамі ў Баку ў маі 2007 года, у чэрвені 2010 года, у лістападзе 2013-га, у чэрвені 2015-га, у лістападзе 2016-га, у красавіку 2021 года, у маі 2024-га, у лістападзе 2024-га... Адносіны паміж Баку і Мінскам ужо выйшлі на ўзровень стратэгічнага партнёрства. Гэту новую якасць важна браць пад увагу, асабліва з улікам таго што свет цяпер знаходзіцца ў стане самага беспрэцэдэнтнага крызісу з часоў Другой сусветнай вайны. Беларусь і Азербайджан на працягу сваёй найноўшай гісторыі як сапраўды суверэнныя дзяржавы змаглі вытрымаць каласальны націск, які аказвалі на іх, і перш за ўсё — з боку Захаду.

Яны не канкуруюць паміж сабой нідзе і ні ў чым, але здольныя ўзаемавыгадна дапаўняць адзін аднаго. Беларусь, якая змагла захаваць сваю буйную дзяржаўную прамысловасць, валодае магутнейшым патэнцыялам для далейшага супрацоўніцтва. Беларускія будаўнікі, якія ўжо ўзвялі шэраг аб'ектаў у Ісмаільінскім раёне ў 2013—2014 гады, бяруць удзел у аднаўленчых работах на тэрыторыі вызваленага Карабахскага рэгіёна. Кансультацыі беларускіх спецыялістаў ужо выкарыстоўваюцца пры рэалізацыі дзяржаўнай праграмы адраджэння Карабаха. Пасля вырашэння Карабахскага канфлікту асабліва значэнне павінны набыць аўтатранспартныя перавозкі і ўвогуле развіццё лагістыкі, якія ўяўляюць галіну ўзаемнай зацікаўленасці. Беларусь таксама актыўна ўдзельнічае ў праграмах па аграрным сектары, у прыватнасці ў стварэнні перадавых жывёлагадоўчых комплексаў.

Ну і зразумела, што ў сувязі са складанымі міжнароднымі абставінамі ўсё большую актуальнасць набывае ваенна-абароннае супрацоўніцтва Беларусі і Азербайджана. Пры гэтым Беларусь заўсёды выступала як міратворчая пляцоўка на постсавецкай прасторы, прапаноўваючы свае паслугі ў вырашэнні любых канфліктаў.

Прыемна заўважыць, што за апошнія гады значна актывізавалася ўзаемадзеянне ў сферах аховы здароўя, навукі, адукацыі, спорту і турызму паміж нашымі краінамі.

Можна смела заўважыць, што беларускаму і азербайджанскаму народам, нашым краінам проста наканавана шырокае развіццё самых цесных сяброўскіх адносін. Паколькі мы ўсе жадаем жыць у моцным і стабільным свеце, іначай нельга. І нядаўняя сустрэча кіраўнікоў двух дзяржаў заклала яшчэ адзін камень у фундамент такога супрацоўніцтва. Гэта паказвае прыклад, як здольныя складвацца шчырыя і пазітыўныя адносіны паміж незалежнымі дзяржавамі.

Гутарыў
Кастусь ЛАДУЦЬКА.
Баку — Мінск.

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению **ЧПУП «Керестеа»** (продавец) извещает о проведении **19 декабря 2024 года** открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

Наименование имущества
Лот № 1: капитальное строение с инв. № 324/С-10291 площадью 441,8 кв. м (здание механической мастерской, назначение здание специализированно автомобильного транспорта, составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание). Капитальное строение с инв. № 324/С-8693 площадью 243,8 кв. м (здание гаража, назначение здание специализированное автомобильного транспорта, составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание). Капитальное строение с инв. № 324/С-8694 площадью 144,5 кв. м (здание склада, назначение здание нежилое, составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание). Капитальное строение с инв. № 324/С-8695 площадью 460,3 кв. м (здание склада, назначение здание нежилое, составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание). Капитальное строение с инв. № 324/С-8691 площадью 78,0 кв. м (здание бани, назначение здание нежилое, составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание)
Капитальные строения расположены на земельных участках с кадастровыми номерами 325650100001002724, 325650100001002340, 325650100001002615 по адресу: Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Восточная, 90
Начальная цена продажи без НДС – 86280,00 бел. руб. **Задаток** – 862,80 бел. руб.

Продавец: ЧПУП «Керестеа», г. Гомель, пр-т Ленина, д. 31, к. 2. Конт. тел. +375296436025.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 18.12.2024 г. в 17.00.

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте **www.deloocenka.by.**

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения. Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **90 (девяноста)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Конт. тел. организатора аукциона:
+375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Белинвестбанк»** (Продавец) на праве собственности.

Электронные торги состоятся 10.12.2024.

Лот № 1. Изолированное помещение № 440
с инв. № 600/D-64279, 12,1 кв. м.
Начальная цена с НДС 20 % – 5 400,00 руб.
Задаток – 540,00 руб.

Лот № 2. Изолированное помещение № 441
с инв. № 600/D-64280, 12,1 кв. м.
Начальная цена с НДС 20 % – 5 400,00 руб.
Задаток – 540,00 руб.

Лот № 3. Изолированное помещение № 438
с инв. № 600/D-64303, 12,0 кв. м.
Начальная цена с НДС 20 % – 5 400,00 руб.
Задаток – 540,00 руб.

Лот № 4. Изолированное помещение № 439
с инв. № 600/D-64304, 12,0 кв. м.
Начальная цена с НДС 20 % – 5 400,00 руб.
Задаток – 540,00 руб.

Лот № 5. Изолированное помещение № 443
с инв. № 600/D-64309, 12,1 кв. м.
Начальная цена с НДС 20 % – 5 400,00 руб.
Задаток – 540,00 руб.

Лот № 6. Изолированное помещение № 442
с инв. № 600/D-64310, 12,1 кв. м.
Начальная цена с НДС 20 % – 5 400,00 руб.
Задаток – 540,00 руб.

Лот № 7. Изолированное помещение № 549
с инв. № 600/D-64448, 17,0 кв. м.
Начальная цена с НДС 20 % – 7 680,00 руб.
Задаток – 768,00 руб.

Адрес Лотов №№ 1–7:
Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район аг. Озерцо, Менковский тракт, 2 – 440, 2 – 441, 2 – 438, 2 – 439, 2 – 443, 2 – 442, 2 – 549.

Шаг электронных торгов – 5 %.

Срок для заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов (после предъявления Продавцу копии платежного документа, подтверждающего оплату вознаграждения и затрат на организацию и проведение электронных торгов Организатору электронных торгов).

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900 100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **05.12.2024 в 16.00.**

Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by. Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390
Продавец	СТОАО «Світанак», Гродненская обл., г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 4. УНП 500041006
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, **www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов

Лот № 1

Здание (здание специализированное коммунального хозяйства, инв. № 450/С-24780, общ. пл. 414,8 кв. м, составные части и принадлежности: две пристройки); **канализационные сети** (сооружение специализир. коммун. хозяйства, инв. № 450/С-24783, составные части и принадлежности: канализац. колодец); **тепловая сеть** (сооружение специализир. коммун. хозяйства, инв. № 450/С-24781). **Обременение: договор аренды.**
Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Брестская, д. 67, корп. 1.**
Сведения о земельном участке 425450100001007814: пл. **0,0587 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 20.09.2071) для строительства и размещения объектов коммунального хозяйства.
В состав лота входит иное имущество: линия электросетей (м-н Интерьер)

Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 120 622,80 бел. руб.

Лот № 2

Склад (баня) (здание многофункциональное, инв. № 450/С-18993, общ. пл. 318 кв. м, составные части и принадлежности: уборная, три пристройки, ворота, забор).
Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Хлюпина, д. 14.**
Сведения о земельном участке 425450100001010315: пл. **0,1445 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 01.11.2041) для строительства и обслуживания здания склада (бани)

Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 25 920,00 бел. руб.

Лот № 3

Столовая (здание специализированное для общественного питания, инв. № 450/С-18925, общ. пл. 672,7 кв. м, составные части и принадлежности: подвал, две пристройки, электроснабжение (1), канализационная сеть (Д), водопроводная сеть (Е), канализационный колодец (д1), водопроводный колодец (е1), покрытие (Ж, И, К), плиточное покрытие (Л), бордюр тротуарный (Л1), ограждение (М, Н), калитка (Н1)). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 283, корп. 1.**
Сведения о земельном участке 425450100001006208: пл. **0,1316 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 20.09.2071) для строительства и обслуживания здания столовой

Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 331 716,00 бел. руб.

Лот № 4

Административное здание (совместно с гаражом и котельной) (здание многофункциональное, инв. № 450/С-29152, общ. пл. 547,3 кв. м, составные части и принадлежности: пристройка, дымовая труба), **склад № 2** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. № 450/С-29155, общ. пл. 568 кв. м, составные части и принадлежности: пристройка (2Б/кз), пристройка (1)); **трансформаторная подстанция** (сооружение специализированное энергетики, инв. № 450/С-29156, общ. пл. 40,1 кв. м); **здание проходной** (Здание специализированное иного назначения, инв. № 450/С-29153, общ. пл. 31.6 кв. м); **благоустройство территории** (сооружение неустановленного назначения, инв. № 450/С-31422, общ. пл. 1076,1 кв. м. Составные части и принадлежности: А-Благоустройство территории, а1 Покрытие, а1.1 Бордюр, а2 Ограждение, а2.1 Ворота, а3 Эстакада, а3.1 Ограждение). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Минский тракт, д. 4 корп. 1-3, д. 4, 4/4.**
***Сведения о земельном участке 425450100000001880*:** пл. **0,6679 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 30.07.2068) для размещения объектов оптовой торговли, материально-технич. и продовольствен. снабжения, заготовок и сбыта продукции.
В состав лота входит иное имущество: котел отопительный твердотопливный КОТВ-95; насос К45/30с дв. 7,5/3000

Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 430 080,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере **4 %** от цены продажи лотов №№ 1, 3, 4, **6 %** от цены продажи лота № 2 в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 15.10.2024

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
09.12.2024 с 11.00 до 12.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 06.12.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
E-mail: auction@cpo.by

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества
ООО «Торговая компания Ромакс»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1757	Капитальное строение с инвентарным номером 123/С-1069 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина, составные части и принадлежности – уборная, подвал, мощение, ограждение, электрическая сеть, канализационная сеть, водопроводная сеть, тепловая сеть; общая площадь – 1147,0 кв. м)	1 920 000,00	96 000,00	96 000,00
В отношении лота проводятся первые торги				
В отношении лота имеется ограничение (обременение) в виде залога (залогодержатель – ОАО «Белагропромбанк») и ограничение (обременение) в виде аренды. Подробнее по тел. +375293110464 (Анастасия)				
Местонахождение лота: Брестская обл., Кобринский р-н, г. Кобрин, ул. Ленина, 13. Лот расположен на земельном участке с кадастровым номером 124350100001000656 на праве постоянного пользования (площадь 0,0963 га) для обслуживания здания магазина				
Дата и время проведения торгов	**27 декабря 2024 года в 16.30 (регистрация с 16.00 до 16.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127			
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	С 10.00 27 ноября 2024 года до 15.00 26 декабря 2024 года			

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту 1757, ООО «Торговая компания Ромакс», проводимых 27.12.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: 5 % от конечной цены предмета торгов.** Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **80292029540, Светлана.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

Информация о продавце	**ООО «Торговая компания Ромакс» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375173958917 (г. Минск, ул. Кульман, дом 35А, пом. 8, УНП 190761848)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

Признать недействительным бланк строгой отчетности по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь формы ОГОК серии КМ, № 0068821, в количестве 1 шт. представительства Белгосстраха по Червенскому району.

УНП 100122726

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

«ХРУСТАЛЬНАЯ» ХВАРОБА

Ад чаго ўзнікае астэапароз і як яго папярэдзіць?

Хто з нас у дзяцінстве ці старэйшым узросце не меў у сваім «паслужным спісе» пераломаў костак. Дык і што? Было і прайшло, і нават не заўсёды мы можам успомніць аб перанесеных траўмах на прыёме ва ўрача. Але, як ні дзіўна, пра стан сваёй касцявой сістэмы мы амаль што не думаем нават ва ўзросце за 40. Па даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, астэапароз, як прычына інваліднасці і смяротнасці чалавека, займае чацвёртае месца ў свеце пасля такіх захворванняў, як сардэчна-сасудзістыя, анкалагічныя і цукровы дыябет. Пра гэта небяспечнае захворванне размаўляем з урачом-хірургам 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Таццянай ЦЯСЛЕНКА.

— Таццяна Аляксееўна, што гэта за хвароба?

— Астэапароз — гэта сістэмнае захворванне шкілета, якое характарызуецца зніжэннем касцявой масы і парушэннем будовы касцявой тканкі. Яно вядзе да павышанай далікатнасці костак і пашкоджвае ўсе косткі шкілета. Астэапароз робіць іх порыстымі і ломкімі, як запалкі. У выніку чалавек можа зламаць, напрыклад, нагу, усяго толькі стукнуўшыся аб парог сваёй хаты.

Касцявая тканка становіцца порыстай, косткі — больш далікатнымі і могуць лёгка ламацца. У перакладзе з латыні тэрмін «астэапароз» азначае «разрэджаная костка». Пераломы з'яўляюцца асноўным ускладненнем астэапарозу. Яны ўзнікаюць нават пры невялікай, мінімальнай траўме, напрыклад пры падзенні на роўным месцы з вышыні ўласнага росту. Пераломы пазванкоў пры астэапарозе могуць здарыцца пры падыманні цяжараў, трасенні пры яздзе.

— Ці ёсць у астэапарозу першыя сімптомы, якія дазваляюць своечасова яго заўважыць?

— Амаль у 50 % выпадкаў астэапароз працякае бессімптомна і выяўляецца ўжо пры наяўнасці пераломаў костак. У многіх пацыентаў з астэапарозам маюцца скаргі на болі ў спіне, якія ўзмацняюцца пасля фізічнай нагрузкі, пры працяглым знаходжанні ў адным становішчы — стоячы ці седзячы. Гэтыя болі знікаюць або прытупляюцца пасля адпачынку ў становішчы лежачы. Вонкава астэапароз праяўляецца змяненнем постаці, зніжэннем росту да старасці, дэфармацыяй грудной клеткі, парушэннем паходкі ў выніку ўшчыльнення пазванкоў і разрэджання касцявой тканкі. Пры наяўнасці астэапарозу пералом пазваночніка можа ўзнікнуць нават у ложку пры нязграбным змяненні становішча — са спіны на бок, а пералом шыйкі сцягна — пры невялікім удары або рэзкім руху.

— Што прыводзіць да астэапарозу?

— Разнастайныя прычыны. Да першай катэгорыі адносяцца тыя фактары, якія чалавек не здольны змяніць, іх называюць некіравальныя. Да такіх адносіцца пол — жанчыны пакутуюць на астэапароз часцей. Гэта звязана з асаблівасцямі гарманальнага статусу, а таксама з меншай агульнай касцявой масай. Акрамя таго, жанчыны губляюць касцявую масу хутчэй і ў большай колькасці ў сувязі з менапаўзай і большай працягласцю жыцця.

Акрамя таго, важны і ўзрост: з моманту нараджэння чалавека адбываецца рост шкілета, павелічэнне аб'ёму і шчыльнасці касцей. Свайго піка касцявая маса дасягае да 25 гадоў, потым надыходзіць перыяд стабільнасці, а ўжо пасля 45 гадоў пачынаецца павольнае, але прагрэсіруючае зніжэнне касцявой масы.

Яшчэ адзін фактар — спадчыннасць. Пры наяўнасці ў найбліжэйшых сваякоў (маці, бацькі, братоў, сясцёр) пераломаў пры мінімальнай траўме ва ўзросце старэйшым за 50 гадоў рызыка астэапарозу ўзрастае.

Да кіравальных фактараў (на якія можна ўздзейнічаць) адносіцца нізкая фізічная актыўнасць. У любым узросце адсутнасць пастаяннай фізічнай нагрузкі можа прывесці да страты касцявой масы. Дарэчы, нізкая маса цела (індэкс масы цела (ІМТ) <20 кг/м^2) з'яўляецца індыкатарам нізкай мінеральнай шчыльнасці косткі.

Курэнне таксама негатыўна ўплывае на нашу касцявую тканку. Шчыльнасць косткі ў курцоў, якія штодзень выкурваюць 20 цыгарэт і больш, у 1,5-2 разы ніжэй, чым у тых, у каго няма гэтай дрэннай звычкі.

Сярод фактараў рызыкі — злоўжыванне алкаголем, бо ён прыводзіць да парушэння засваяльнасці кальцыю і вітаміну D арганізмам, і недастатковае спажыванне кальцыю з ежай. Гэты мікраэлемент, як вядома, з'яўляецца «будаўнічым матэрыялам» косткі. Для забеспячэння засваення кальцыю косткай і абменных працэсаў у касцявой тканцы неабходны вітамін D. Яго дэфіцыт таксама вядзе да астэапарозу. Негатыўным складальнікам з'яўляецца схільнасць да падзенняў у асоб з парушэннямі зроку, слыху, вестыбулярнымі расстройствамі, нізкай фізічнай актыўнасцю.

— Ці можна пазбегнуць гэтай хваробы?

— Рана распачатая актыўная прафілактыка можа істотна паўплываць на распаўсюджанасць, прагрэсіраванне і зыход астэапарозу. Для гэтага трэба прытрымлівацца некалькіх правіл.

Найперш збалансавана харчавацца. Вядома, што адным з асноўных мінералаў, якія аказваюць істотны ўплыў на фарміраванне і падтрыманне шкілета, з'яўляецца кальцый. Асноўныя яго крыніцы — малочныя прадукты, бабовыя, шпінат, зеляніна, арэхі, рыба і морапрадукты.

Для паляпшэння засваення кальцыя ў страўніка-кішачным тракце вельмі важны вітамін D. Апошні паступае ў арганізм у складзе такіх прадуктаў, як рыба, печань, яйкі, а таксама ўтвараецца ў скуры пад уплывам ультрафіялетавых прамянёў. Аднак у восеньска-зімовы перыяд колькасць сонечных дзён рэзка скарачаецца, таму ў гэты час вітамін D варта прымаць дадаткова ў выглядзе лекавых прэпаратаў.

Акрамя таго, неабходна звярнуць увагу на бялковы складнік рацыёну. Трэба спажываць 1-1,2 г бялку на 1 кг масы цела ў дзень. У той жа час трэба памятаць, што залішняе яго спажыванне спрыяе павелічэнню выдзялення кальцыю з мачой. Шкоднымі прадуктамі пры астэапарозе з'яўляюцца кава і павараная соль. Так, кафеін узмацняе выдзяленне кальцыю з мачой у дарослых, а спажыванне чатырох і больш кубкаў кавы ў дзень у жанчын спрыяе зніжэнню касцявой масы. Неабходна абмяжоўваць і спажыванне солі да адной чайнай лыжкі без горкі ў дзень, паколькі яна таксама павышае вылучэнне кальцыю з мачой і таму зніжае мінеральную шчыльнасць касцей у дарослых.

Вельмі важнае падтрыманне нармальнай масы цела. Сачыце за сваёй вагой. Трэба звярнуць увагу, што празмерна худыя жанчыны пакутуюць на астэапароз часцей, чым поўныя. Гэта абумоўлена тым, што тлушчавая клетка здольная сінтэзаваць гармоны, якія стымулююць развіццё касцявой тканкі.

Неабходна адмовіцца ад ужывання тытуню і алкаголю, мець пастаянныя фізічныя нагрузкі. Яны важныя для памяншэння страт касцявой тканкі, паляпшэння раўнавагі і прафілактыкі падзенняў, а таксама для рэабілітацыі пасля перанесеных пераломаў. Фізічная актыўнасць павінна ўключаць хаду, бег, заняткі тэнісам і іншыя віды актыўнасці на свежым паветры. Важна адзначыць, што плаванне не спрыяе ўмацаванню касцей, паколькі бязважкі стан цела ў вадзе не прыводзіць да ўзнікнення неабходнай нагрузкі на касцявыя структуры.

Каб папярэдзіць падзенне, трэба выконваць практыкаванні для паляпшэння раўнавагі, а таксама сачыць за зрокам і слыхам, рэгулярна наведваць акуліста і ЛОР-урача. Пры неабходнасці абавязкова выкарыстоўваць дадатковыя прыстасаванні для хады: хадункі, кій.

ПРАКТЫКАВАННІ ДЛЯ ПАЛЯПШЭННЯ РАЎНАВАГІ:

- ступні знаходзяцца на адной лініі (правая перад левай ці наадварот), рукі на поясе. У гэтым становішчы стаяць 20–30 секунд;
- ногі разам, рукі на поясе. Падняцца на дыбачкі, стаяць 15–20 секунд;
- рукі на поясе, левую нагу сагнуць, адарваўшы ад падлогі. Падняцца на дыбачкі правай нагой, стаяць 15–20 секунд. Выканаць тое ж іншай нагой.

Карысныя прадукты

ЗІМОВЫ ВІТАМІН

Навошта есці журавіны?

Журавіны — гэта ягады на ўсе выпадкі жыцця: забалела горла або замучыў цыстыт — дапаможа журавінавы сок, падняўся артэрыяльны ціск — выратуе жменя свежых ягад, з'явіліся прыкметы прастуды — пераможа ягадны морс. Чырвоныя ягады дзікаслага балотнага хмызняку лічаць суперфудам. У іх складзе вітаміны С, РР, К, B_1, B_2, мноства арганічных кіслот, мікра- і макраэлементаў, флаваноіды, цукры, пекцінавыя, фарбавальныя, азоцістыя, дубільныя рэчывы, фітанцыды. Акрамя гэтага, паўночная ягада змяшчае важныя мікраэлементы, такія як жалеза, марганец, малібдэн, медзь. У ёй ёсць ёд, магній, які ўдзельнічае ў забеспячэнні найважнейшых функцый арганізма, а таксама кобальт, нікель, цынк. Чым карысныя звыклыя ўсім журавіны і як іх можна выкарыстоўваць, нагадала інструктар-валеолаг Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Юлія КЛІМЧАНКА.

Пры лячэнні прастуды журавінавы морс аказвае гарачкапаніжальнае, супрацьзапаленчае, мачагоннае дзеянне. Дзякуючы высокаму ўтрыманню вітаміну С ягада ўмацоўвае імунітэт і дапамагае клеткам аднаўляцца.

Доўгі час захоўваць свежасць журавінам дапамагае бензойная кіслата, якая валодае выяўленымі антыбактэрыяльнымі і супрацьгрыбковымі ўласцівасцямі, спрыяе разрэджванню і адыходжанню макроты пры захворваннях дыхальных шляхоў.

Багатая гаючая ягада флаваноідамі — рэчывамі, якія валодаюць супрацьзапаленчымі, імунамадулюючымі, антымікробнымі і супрацьпухліннымі ўласцівасцямі.

Вядома, спрыяльнае ўздзеянне журавін на лячэнне інфекцый мочавыводзячых шляхоў, прафілактыку сардэчна-сасудзістых захворванняў (поліфенолы журавін перашкаджаюць развіццю атэрасклерозу, гіпертанічнай хваробы і ўтварэнню тромбаў).

Ужыванне журавін паляпшае апетыт і страваванне. Стравы, у складзе якіх ёсць журавіны, можна рэкамендаваць людзям, што пакутуюць на гастрыт з паніжанай кіслотнасцю страўнікавага соку.

Вядомыя каштоўныя ўласцівасці журавін у галіне касметалогіі. Балотная ягада ўваходзіць у састаў касметычных масак, крэмаў, ласьёнаў, дапамагае змагацца з такімі праблемамі, як акнэ, пігментныя плямы, пашыраныя поры, тлусты бляск, ацёкі.

Журавіны ядуць свежымі, замарожваюць, сушаць і замочваюць. З ягад журавін гатуюць розныя морсы, кісялі, жэле, варэнні, соусы да мясных і рыбных страў. Журавіны дадаюць у салаты, пірагі і іншыя стравы. Каб морс быў больш карысны, яго трэба гатаваць правільна. Спачатку працерці ягады, каб атрымаць сок. Потым праварыць макуху, якая засталася пасля выціскання соку. Працадзіць, дадаць цукар ці мёд па смаку. А калі адвар астыне, змяшаць яго разам з журавінавым сокам.

Калі няма супрацьпаказанняў, то дзве шклянкі свежапрыгатаванага журавінавага морсу ў дзень восенню-ўзімку — выдатная прафілактыка рэспіраторных захворванняў, вірусных інфекцый, якія перадаюцца паветрана-кропельным шляхам. Дарэчы, гэта ў некаторай ступені нават танізавальны сродак.

Ад ужывання журавін варта ўстрымацца людзям з індывідуальнай непераноснасцю гэтых ягад; хворым, якія пакутуюць на язвавую хваробу страўніка і дванаццаціперснай кішкі, гастрыт з павышанай кіслотнасцю.

У склад ягады ўваходзяць аксалаты, якія з'яўляюцца структурным элементам асобных відаў нырачных камянёў. Залішняе ўключэнне журавін у рацыён можа пагоршыць ход мачакаменнай хваробы або спрыяць яе развіццю.

Правила проведения РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Мани мечты!»

1. Настоящие Правила проведения рекламной игры «**Мани мечты**!» (далее – Правила) разработаны в соответствии с законодательством Республики Беларусь и определяют порядок проведения рекламной игры «**Мани мечты**!» (далее – Рекламная игра).

2. Сведения об Организаторе.

2.1. Организатором Рекламной игры является ЗАО «Сэлмон-Графикс», УНП 100843219, зарегистрированное Минским горисполкомом Республики Беларусь решением от 02 декабря 2008 года.

2.2. Юридический адрес и местонахождение Организатора: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 40, офис 605.

3. Заинтересованные лица Рекламной игры.

Заинтересованным лицом Рекламной игры является ЗАО «Альфа-Банк», УНП 101541947. 220013, г. Минск, ул. Сурганова, д. 43-47.

4. Наименование Рекламной игры: «Мани мечты!».

5. Территория проведения Рекламной игры: Республика Беларусь.

6. Период проведения Рекламной игры: с 28.11.2024 г. по 14.05.2025 г., включая период розыгрышей, вручения призов и опубликования результатов Рекламной игры.

7. Комиссия по проведению Рекламной игры.

Для проведения Рекламной игры Организатор утверждает Комиссию в следующем составе:

1. Бродинская Ольга Геннадьевна – главный специалист отдела рекламного продвижения для физических лиц ЗАО «Альфа-Банк»;

2. Соколов Юрий Павлович – главный специалист департамента транзакционных продуктов розничного бизнеса ЗАО «Альфа-Банк»;

3. Василькова Елена Александровна – начальник отдела рекламных проектов ЗАО «Сэлмон-Графикс»;

4. Стельмах Александр Петрович – заместитель директора по правовым вопросам ООО «Медиа Крама»;

5. Ермакова Ольга Леонидовна – директор ЗАО «Сэлмон-Графикс» – председатель Комиссии.

